САМАЯ ВЫСОКАЯ МІСІЯ НА ЗЯМЛІ

Дарагія суайчынніцы!

Сардэчна віншую вас з Днём маці!

У гэтае светлае свята ніхто не можа застацца раўнадушным.

Колькі б гадоў нам ні споўнілася, менавіта да маці мы звяртаемся перш за ўсё, менавіта яна больш, чым хто-небудзь іншы, радуецца нашым поспехам, падтрымлівае пры няўдачах, перажывае за кожны наш крок па жыццёвым шляху. Над яе нястомным бацькоўскім клопатам не ўладныя ні час, ні адлегласці.

Па значнасці і адказнасці мацярынская місія не ведае сабе роўных. Даць жыццё малому, выхаваць яго сапраўдным чалавекам — вялікае прызначэнне. Перш за ўсё ад маці дзіця атрымлівае ўрокі маральнасці, справядлівасці, любові да сваёй Айчыны.

Шчаслівы той чалавек, якога ахоўваюць мацярынская любоў і малітва. Таму сёння кожны з нас павінен сказаць самаму дарагому чалавеку цёплыя словы ўдзячнасці.

Мілыя маці і бабулі, нізкі паклон вам!

Дзякуй за падоранае жыццё, за бязмежнае цярпенне, за ўкладзеныя ў нас сілы, за цяпло дамашняга ачага.

Няхай справы, учынкі і лёсы вашых дзяцей і ўнукаў прыносяць вам толькі радасць і гонар.

Будзьце здаровыя і шчаслівыя доўгія-доўгія гады!

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь
Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

14 КАСТРЫЧНІКА 2015 г. СЕРАДА № 198 (28056) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

КРОКІ НАПЕРАД І НАСУСТРАЧ

Прэзідэнт Беларусі прапануе Аўстрыі адкрыць новую старонку ў адносінах

Пра гэта Аляксандр Лукашэнка заявіў на сустрэчы з прэзідэнтам Палаты эканомікі Аўстрыі Крыстафам Ляйтлам і першым намеснікам старшыні Нацыянальнага савета Аўстрыі Карлхайнцам Копфам.

«Нам трэба на аснове таго вопыту супрацоўніцтва, які ў нас ёсць, адкрываць новую старонку і рухацца наперад», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Прэзідэнт падзякаваў аўстрыйскаму боку за інвестыцыі і крэдытную дапамогу, аказаную пры мадэрнізацыі беларускіх прадпрыемстваў. Ён падкрэсліў, што ў Беларусі будуць з вялікім задавальненнем вітаць аўстрыйскі бізнес.

«Умова толькі адна — каб тыя, хто прыходзіць сюды, ставіліся да нашага народа так, як да працоўных у Аўстрыі, — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы. — Мы вас будзем абараняць так, як і свае беларускія кампаніі. Вы нам чужымі не будзеце, мы будзем рабіць усё, каб вам тут было камфортна. І з боку аўстрыйскага бізнесу такія ж павінны быць прыстойныя адносіны да нашай дзяржавы, да нашага народа».

Аляксандр Лукашэнка лічыць невыпадковай сустрэчу менавіта з прадстаўнікамі аўстрыйскай дзяржавы пасля праведзеных у Беларусі прэзідэнцкіх выбараў. Ён звярнуў увагу, што ў пачатку яго першага прэзідэнцкага тэрміну ў яго памяці засталіся сустрэчы і тэмы, звязаныя з узаемаадносінамі з Аўстрыяй. «І мне тады падалося, што Захад неяк размеркаваў свае ролі на постсавецкай прасторы, і нам дасталася такая высокатэхналагічная і ў чымсьці падобная да нас Аўстрыя», — сказаў беларускі лідар.

«На гэтым этапе, калі быццам бы ў нас пацяпленне адбываецца з Еўрасаюзам і з асобнымі краінамі Еўрасаюза, напэўна, невыпадкова і заканамерна тое, што мы сёння сустракаемся з вамі і ў Мінску праходзяць мерапрыемствы, звязаныя з эканамічным супрацоўніцтвам: з аднаго боку прадстаўнікі Еўразійскага эканамічнага саюза, з другога — Еўрапейскага саюза ў асобе не чужой ужо нам Аўстрыі», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі.

«Новы этап пачынаецца ў жыцці маім і, напэўна, нашага грамадства ў цэлым. Гэта яшчэ трэба асэнсаваць», — дадаў ён.

У сваю чаргу першы намеснік старшыні Нацыянальнага савета Аўстрыі Карлхайнц Копф лічыць, што ўслед за прыпыненнем ЕС санкцый у дачыненні да Беларусі будуць зроблены і іншыя крокі, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта.

«Не бывае выпадковых супадзенняў. Думаю, што наша сустрэча таксама невыпадковае супадзенне, а ўдалы збег абставінаў», — сказаў ён.

«У мінулую нядзелю вы атрымалі пераканаўчую перамогу на прэзідэнцкіх выбарах. Учора Еўрасаюз зрабіў першы крок да адмены санкцый. Упэўнены, што за гэтым будуць і іншыя крокі і ў нашых адносінах сапраўды будзе адкрыта новая старонка, мы ўступім у новую эру», — адзначыў Карлхайнц Копф.

Ён выказаў задавальненне тым, што Аўстрыя традыцыйна адыгрывала важную ролю ў наладжванні кантактаў паміж Беларуссю і ЕС у зняцці напружанасці. «У гэтым сэнсе мы ўнеслі пэўны ўклад і рады гэтаму», — сказаў першы намеснік старшыні Нацыянальнага савета Аўстрыі.

ВІНШАВАННІ З ПЕРАМОГАЙ

У адрас Аляксандра Лукашэнкі працягваюць паступаць віншаванні ў сувязі з яго перавыбраннем на пасаду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы.

Адбылася тэлефонная размова прэзідэнтаў Беларусі і Таджыкістана. Кіраўнікі дзяржаў абмяняліся думкамі па некаторых актуальных пытаннях двухбаковага беларуска-таджыкскага парадку дня. Эмамалі Рахмон павіншаваў Аляксандра Лукашэнку з перавыбраннем на пасаду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

У тэлефоннай размове Аляксандра Лукашэнкі з Прэзідэнтам Рэспублікі Малдова Мікалаем Цімофці кіраўнікі дзяржаў коратка закранулі некаторыя пытанні беларуска-малдаўскіх адносін. Мікалай Цімофці павіншаваў Аляксандра Лукашэнку з перавыбраннем на пасаду Прэзідэнта Беларусі.

Беларускага лідара павіншавалі з перамогай на выбарах Прэзідэнт Азербайджанскай Рэспублікі Ільхам Аліеў, Прэзідэнт Рэспублікі Арменія Серж Саргсян, Прэзідэнт Рэспублікі Нікарагуа Даніэль Артэга, Прэзідэнт Рэспублікі Сербія Таміслаў Нікаліч, Прэзідэнт Рэспублікі Узбекістан Ісламам Карымаў.

ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

15 кастрычніка 2015 года ў 10.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 9) адбудзецца пасяджэнне дзясятай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання.

■ Святочнае

СПАЧАТКУ БЫЛА... МАМА

Напэўна, не цяжка падабраць трапяткія і шчырыя словы, каб выказаць сваё прызнанне самай любімай і самай блізкай жанчыне на свеце. Але колькі б мы ні казалі, колькі б ні складалі вершаў у гонар маці, гэтых слоў ніколі не будзе зашмат...

СТАР.2

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЦЫТАТА ДНЯ

Анатоль ЧОРНЫ, міністр архітэктуры і будаўніцтва:

«На наступны год прадугледжана прафінансаваць на Br7,3 трлн будаўніцтва жылля з дзяржпадтрымкай. Гэта і дзяржзаказ, і кватэры для шматдзетных сем'яў. Ёсць і некалькі ЖБВК, якія неабходна скончыць у 2016 годзе. Цяпер у нас налічваецца 14 дамоў з перавышэннем нарматыўных тэрмінаў будаўніцтва. Да канца года плануем, што застанецца адзін. Адзначу, што будаўнічыя работы апярэджваюць графік выдзялення сродкаў. Калі нейкія аб'екты не паспеем прафінансаваць сёлета, па выніках студзеня наступнага года разлічымся. Новыя праблемныя дамы з'явіцца не павінны».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.10.2015 г.

Долар ЗША	17243,00	▲
Еўра	19646,00	▲
Рас. руб.	277,14	▼
Укр. грыўня	784,66	▲

■ Падзея

СТАНДАРТЫ МІЖНАРОДНАГА ЎЗРОЎНЮ

Генасамблея МЭК, якая праходзіць у Мінску, адкрывае новыя магчымасці для айчынных вытворцаў

У Мінску адбылася ўрачыстая цырымонія адкрыцця 79-й Генеральнай асамблеі Міжнароднай электратэхнічнай камісіі. Як адзначыў прэм'ер-міністр Андрэй Кабякоў, гэта падзея з'яўляецца знакавай для Беларусі і будзе садзейнічаць фарміраванню яе іміджу як дзяржавы з прывабнымі ўмовамі для вядзення бізнесу, сучасным узроўнем прамысловасці і навукі.

Падчас цырымоніі адкрыцця 79-й Генеральнай асамблеі МЭК.

Фота БЕЛТА.

ВЫСОКАЯ ЯКАСЦЬ У ПРЫЯРЫТЭЦЕ

Падчас урачыстага адкрыцця **прэм'ер-міністр Андрэй КАБЯКОЎ** у сваім выступленні падзякаваў прэзідэнту МЭК Дзюндзі Намура і генеральнаму сакратару, выканаўчаму дырэктару МЭК Францу Врэсвіку за падтрымку рашэння аб правядзенні Генасамблеі ў Беларусі. Паводле яго слоў, прамысловасць нашай краіны арыентуецца на выпуск якаснай прадукцыі, укараненне інавацый, мадэрнізацыю тэхналагічных і кіраўнічых працэсаў, а таксама эканомнае выкарыстанне рэсурсаў. Прычым найбольш актуальныя гэтыя пытанні менавіта зараз якраз таму, што на глабальным рынку як ніколі раней узмацняецца канкурэнцыя, а таксама развіваюцца інтэграцыйныя працэсы ў многіх рэгіёнах. Сёння развіццё любой эканомікі непарыўна звязана з рацыянальным выкарыстаннем усіх відаў рэсурсаў і энергазбяражэннем, таму павышэнне эфектыўнасці выкарыстання энергіі з'яўляецца адной з базавых умоў устойлівага развіцця эканомікі. Андрэй Кабякоў адзначыў, што ўдзел Беларусі ў міжнародных арганізацыях па стандартызацыі дапамагае фарміраваць прадуманую тэхнічную палітыку краіны, што дазваляе скараціць выдаткі і спрыяе спрашчэнню для міжнароднага гандлю.

ВЫЗНАЧАЦЬ ТЭХНАЛОГІІ БУДУЧЫНІ

Старшыня Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Віктар НАЗАРАНКА ў сваю чаргу адзначыў, што карысць для прамысловасці і бізнесу Беларусі ад правядзення мерапрыемства відавочная. Ён мяркуе, што падзея паспрыяе актывізацыі ўдзелу беларускіх экспертаў у міжнароднай стандартызацыі.

«Сфера дзейнасці Генеральнай асамблеі МЭК мае на ўвазе распрацоўку міжнародных стандартаў у галіне энергетыкі, электратэхнікі, электронікі, інфармацыйна-камунікацыйных прыбораў — усяго таго, што з'яўляецца асновай для развіцця тэхналогій будучыні. Можна сказаць, што тыя пасяджэнні, якія праходзілі ўвесь мінулы тыдзень да цырымоніі адкрыцця, вызначалі, якой заўтра будзе тэхніка і энергетыка», — растлумачыў Віктар Назаранка.

Ён таксама расказаў, што для экспертаў усяго свету асабліва важным з'яўляецца абмеркаванне таго, што зменіцца ў будучыні для спажыўцоў электрычнасці.

«Для нашай краіны асабліва важна развівацца разам з сусветнымі стандартамі. Каб быць канкурэнтаздольнымі, неабходна ствараць свае стандарты, на якія будуць арыентавацца іншыя краіны. Мы экспартаарыентаваная дзяржава, нам важна ведаць, што трэба ў іншых рэгіёнах, і таму мы павінны актыўна ўдзельнічаць ва ўсіх працэсах, якія адбываюцца ў сферы стандартызацыі», — падкрэсліў Віктар Назаранка.

Прэзідэнт МЭК Дзюндзі Намура і генеральны сакратар МЭК Франц Врэсвік адзначылі высокі ўзровень падрыхтоўкі Генасамблеі.

«Мы лічым, што гэтая сустрэча мае важнае значэнне для прамысловасці Беларусі. Гэта магчымасць для вашых экспертаў сустрэцца з калегамі з усяго свету. Больш за тое, у рамках сустрэч тэхнічных камітэтаў плануецца распрацоўка новых стандартаў, дзе беларускі бок можа ўзяць удзел», — адзначыў сакратар МЭК Франц Врэсвік.

Падчас 79-й Генеральнай асамблеі МЭК эксперты будуць абмяркоўваць пытанні ўкаранення аднаўляльных крыніц энергіі, рацыянальнага выкарыстання электрычнасці, сучасных прыбораў і абсталявання — усё тое, чым сёння могуць карыстацца і ўжываць у свеце найбольш развітыя краіны.

Ілья КРЫЖЭВІЧ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Ізраіль: тры чалавекі загінулі, дзясяткі паранены

У Ізраілі тэрарысты працягваюць адзінкавыя напады на мясцовых жыхароў. Тры чалавекі загінулі, дзясяткі пацярпелі падчас пяці нападаў зламыснікаў у Іерусаліме і Раанане, як паведамляе інфармацыйны партал Ynet. Па звестках газеты Haaretz, у серыі нападаў загінулі тры чалавекі, раненні ў ходзе чатырох нападаў атрымалі больш за 30 чалавек.

Антыісламскія актывісты правялі мітынг у Дрэздане

У акцыі пратэсту, арганізаванай антыісламскай групай PEGIDA ў нямецкім Дрэздане, прыняло ўдзел каля 8000 чалавек, як перадаюць інфармагенцтвы. Выступоўцы, у тым ліку сузаснавальнік групы Лютц Бахман, асудзілі рашэнне канцлера Германіі Ангелы Меркель і яе ўрада прыняць сотні тысяч бежанцаў, многія з якіх прыбылі з Сірыі, Афганістана і Ірака. «Яны вядуць нас да еўрапейскай грамадзянскай вайны», — заявіў Бахман. Пратэстоўцы адказалі скандзіраваннем «Меркель павінна сысці» і заклікамі дэпартаваць бежанцаў.

Еўропу накрылі моцныя снегапады

Небывалыя для восені снегапады накрываюць еўрапейскія краіны. Як паведамляюць інфармагенцтвы, заўчасная зіма заблакіравала аўтамагістралі і забрала жыцці некалькіх чалавек. Так, у выніку моцных снегападаў у некаторых ваяводствах на поўдні Польшчы загінулі два чалавекі. З прычыны слізкіх дарог у аварыі загінула сямігадовая дзяўчынка. Яшчэ адзін чалавек замерз, заснуўшы на лаўцы. Вышыня снежнага покрыва месцамі дасягае 20 см. Напярэдадні ў паўночных раёнах Славакіі выпала каля 25 см снегу, які стаў прычынай дзясяткаў буйных аўтааварый. Метэаролагі прагназуюць верагоднасць узмацнення снегападаў. У Румыніі ад снегападаў і шквальных парываў ветру дзясяткі населеных пунктаў засталіся без святла, частка аўтадарог заблакіравана.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Сыр з цвіллю і гарох абароняць ад раку і хваробы Альцгеймера

Паводле слоў спецыялістаў з Інстытута Вейцмана, прадукты, багатыя на спермідын, такія як зялёны гарох, кукуруза, соевыя бабы і блакітныя сыры, дапамагаюць пражыць даўжэй. Ад зніжэння ўзроўню поліамінаў у арганізме цыркадныя рытмы запавольваюцца. Аднак дабаўкі са спермідынам здольныя гэта змяніць. Яны амалоджваюць арганізм і зніжаюць рызыку ўзроставых захворванняў, піша The Daily Mail. Поліаміны — малекулы, якія арганізм атрымлівае з ежай. Акрамя таго, яны выпрацоўваюцца ў клетках. Гэтыя малекулы рэгулююць шэраг важных працэсаў, напрыклад рост і размнажэнне клетак.

КАРАТКА

У Мінску ў сакавіку—верасні гэтага года прынята 1 тыс. 475 рашэнняў аб прызначэнні сямейнага капіталу, у Брэсцкай вобласці — 1 тыс. 757, Віцебскай — 738, Гомельскай — 1 тыс. 309, Гродзенскай — 1 тыс. 134, Мінскай — 1 тыс. 512, Магілёўскай вобласці — 824.

Савет ЕС прыняў рашэнне прыпыніць на 4 месяцы дзеянне санкцый у дачыненні да Беларусі.

Электрацягнікі гарадскіх ліній злучаць Мінск з горадам-спадарожнікам Смалявічы ўжо ў лістападзе.

Міністэрства па падатках і зборах Беларусі зацвердзіла Інструкцыю аб парадку ажыццяўлення кантролю за адпаведнасцю расходаў грамадзян іх даходам. Разлік будзе складацца за кожны каляндарны год на падставе існуючых у распараджэнні падатковых органаў звестак без запатрабавання дэкларацыі. Калі расходы грамадзяніна перавышаюць яго даходы, то яму накіроўваецца пісьмовае патрабаванне аб дачы тлумачэнняў аб крыніцах даходаў.

Бліскучая атрута з табліцы Мендзялеева

Ртуць па-ранейшаму застаецца крыніцай высокай небяспекі

У даўнія часы людзей ад кішэчнай непраходнасці лячылі вельмі проста: давалі выпіць... шклянку ртуці. Старажытныя эскулапы думалі, што яна лёгка пройдзе па кішэчніку і «праб'е» яго з-за сваёй цяжкасці і цякучасці. Але небаракі пасля такога лячэння рэдка выжывалі.

— Цяпер жа такое варварства беспаваротна сышло ў гісторыю, — расказвае **начальнік цэнтра хімічнай і радыяцыйнай абароны Рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння МНС Васіль ШАЛЕПІН.** — Праўда, аб'ёмы ртуці, якія могуць нашкодзіць чалавеку, не зменшыліся. Некалькі гадоў таму нас выклікалі на домабудаўнічы камбінат. Хтосьці з супрацоўнікаў разліў каля паўкілаграма ртуці ў раздзявальні. Змены мяняліся, людзі хадзілі туды-сюды... А калі нас выклікалі ў гэтую раздзявальню, мы зніякавелі: усё было заліта рознакалібернымі шарыкамі ртуці. Нам паставілі задачу: завод праз суткі мусіў зноў працаваць, бо прастой прыносіў вялікі ўрон. Яе мы выканалі. Але калі б ртуць пастаяла хоць некалькі дзён, такога эфекту не дабіліся б...

СТАР. 6

■ Парламенцкі дзённік

Аўстрыя высока цэніць міратворчую палітыку нашай краіны

Старшыня Палаты прадстаўнікоў сустрэўся з аўстрыйскім парламентарыем

Наша краіна заўсёды выступала і выступае за раўнапраўныя адносіны з усімі дзяржавамі. Пра гэта заявіў старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА падчас сустрэчы з Карлхайнцам Копфам, першым намеснікам старшыні Нацыянальнага савета Аўстрыйскай Рэспублікі.

— Падчас сустрэчы з Прэзідэнтам вы шмат гаварылі пра развіццё нашых эканамічных стасункаў, — адзначыў спікер. — Думаю, у нас таксама ёсць велізарны патэнцыял супрацоўніцтва ў галіне навукі, культуры, адукацыі, медыцыны, спорту і турызму.

Кажучы пра міжпарламенцкія кантакты Уладзімір Андрэйчанка выказаў спадзяванні, што яны будуць развівацца больш актыўна.

У сваю чаргу Карлхайнц Копф заявіў: «Мы вельмі высока цэнім намаганні кіраўніцтва Беларусі і, перш за ўсё, Прэзідэнта Беларусі па дасягненні прагрэсу ва ўрэгуляванні ўкраінскай праблемы». Ён дадаў, што такой думкі прытрымліваецца і Еўрасаюз у цэлым.

— Беларусь з'яўляецца краінай, стабільнай не толькі з пункту гледжання ўнутранай палітыкі, яна прыкладае намаганні для таго, каб стабілізаваць сітуацыю ў рэгіёне. Можам з упэўненасцю сказаць, што Беларусь з'яўляецца донарам стабільнасці ў рэгіянальным кантэксце.

Надзея ЮШКЕВІЧ. *yushkevich@zviazda.by*

■ Дыялог бізнесаў

На адной дзелавой мове

На Другім Расійска-Беларуска-Аўстрыйскім форуме перспектывы супрацоўніцтва і магчымыя кантракты абмяркоўвалі каля ста прадпрыемстваў і арганізацый з трох краін.

Сфера энергетыкі

Як заявіў **першы намеснік старшыні Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Аляксандр НАХАЕНКА,** самы буйны кантракт, які плануецца падпісаць на бізнес-форуме, складзе 300 млн долараў у сферы энергетыкі. Ён таксама падкрэсліў, што Беларусь супрацоўнічае з Аўстрыяй у розных галінах — ад сельскай гаспадаркі да высокіх тэхналогій, тэхнікі, інфарматыкі, электронікі, энергетыкі. Паводле таго, як размеркаваліся ўдзельнікі форуму па рабочых секцыях, можна адзначыць, што найбольшая колькасць удзельнікаў падалі заяўку на секцыю «Энергетыка, інфраструктура і лагістыка» — каля 120 кампаній з трох краін. Будуць працаваць яшчэ дзве секцыі: «Сельская гаспадарка і прадукты харчавання» і «ЕС-ЕАЭС: перспектывы ўзаемадзеяння бізнес-асацыяцый у рамках еўрапейскіх і еўразійскіх інтэграцыйных працэсаў». Падчас сустрэчы павінны адбыцца індывідуальныя перамовы паміж бізнесменамі Аўстрыі, Беларусі і Расіі.

Штуршок развіццю

Прэзідэнт Палаты эканомікі Аўстрыі Крыстаф ЛЯЙТЛ надае Беларусі ролю моста паміж буйнымі інтэграцыйнымі аб'яднаннямі ЕС і ЕАЭС. Паводле яго слоў, дыялог, які вядзецца тут, здольны стварыць неабходныя ўмовы функцыянавання эканомік.

«Такім чынам ЕС і ЕАЭС сапраўды могуць стаць бліжэй. І менавіта гэты трохбаковы форум дае ўсяму штуршок», — адзначыў Крыстаф Ляйтл.

Сучасная Аўстрыя мае багаты вопыт развіцця ў сферах энергетыкі, аховы здароўя, электронікі, машынабудавання. І, паводле яго слоў, аўстрыйскі бок знаходзіцца на форуме якраз для таго, каб знайсці кааперацыйныя сувязі з кампаніямі, што маглі б сумесна працаваць у гэтых сферах.

Акрамя таго, паводле слоў **дзяржаўнага сакратара Саюзнай дзяржавы Рыгора РАПОТЫ,** Аўстрыя адкрытая да дыялогу і з'яўляецца адным з актыўных інвестараў у эканоміку як Беларусі, так і Расіі.

«Аўстрыйскіх бізнесменаў не трэба ўгаворваць. Яны зацікаўлены ў тым, каб з'явіўся яшчэ адзін інстытут. Хочацца верыць, што гэты форум будзе пастаянна дзейным механізмам узаемадзеяння яшчэ і не толькі з Аўстрыяй», — адзначыў Рыгор Рапота.

На думку Рыгора Рапоты, правядзенне такога мерапрыемства — вялікая карысць для Беларусі і Расіі, таму што гэта яшчэ адзін канал дыялогу з аўстрыйскімі бізнесменамі. «У нас іх некалькі, і мы стараемся іх падтрымліваць».

Ілья КРЫЖЭВІЧ. *kryzhevich@zviazda.by*

Электраэнергія для прадпрыемстваў і налета даражэць не будзе

А тарыфы для насельніцтва плануюць карэктаваць толькі ў цеснай звязцы з павелічэннем даходаў

Аб гэтым паведаміў учора на ўрачыстым адкрыцці XX Беларускага энергетычнага і экалагічнага форуму міністр энергетыкі Беларусі Уладзімір ПАТУПЧЫК.

Міністр адзначыў, што ўжо на працягу трох гадоў тарыфы на электраэнергію для рэальнага сектара эканомікі ўвесь час толькі памяншаюцца. Больш за тое, Уладзімір Патупчык запэўніў, што гэтыя тарыфы застаюцца даволі стабільнымі, а для рэальнага сектара эканомікі іх не плануецца павялічваць нават на 2016 год. Разам з тым, кіраўнік галіны паведаміў, што цяпер спецыялісты пралічваюць у праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі, як гэтыя тарыфы будуць змяняцца ў сярэдне- і кароткатэрміновай перспектыве. «Гэты працэс не з'яўляецца статычным, таму, безумоўна, для таго каб мы не адставалі ад тых працэсаў, якія адбываюцца ў макраэканоміцы, тарыфы на электрычнасць для насельніцтва будуць павялічвацца, але яны будуць абавязкова ўвязаны з узроўнем даходаў нашых людзей», — удакладніў пазіцыю міністэрства Уладзімір Патупчык.

Павышэнне энергаэфектыўнасці прадпрыемстваў энергетыкі ўжо сёння дае свае станоўчыя вынікі. Паводле слоў Уладзіміра Патупчыка, пачынаючы з наступнага года галіна пачне эканоміць для краіны штогод каля 200 млн долараў. А яшчэ міністр паведаміў, што назапашаны за кошт рэалізацыі дзяржпраграм 2006—2014 гадоў эфект склаў ужо каля 600 млн долараў. «Такім чынам мы ўносім свой уклад у стабільнасць на валютным рынку і павышэнне канкурэнтаздольнасці беларускай эканомікі ў цэлым», — дадаў ён.

Нагадаем, што XX Беларускі энергетычны і экалагічны форум праходзіць у Мінску з 13 па 16 кастрычніка. Яго ўдзельнікаў чакае насычаная дзелавая праграма, якая аб'ядноўвае 20 мерапрыемстваў. У рамках форуму адбудуцца і сумесныя мерапрыемствы ў межах 79-й Генеральнай асамблеі Міжнароднай электратэхнічнай камісіі, якая праходзіць у Мінску з 5 па 16 кастрычніка.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

■ Меркаванне

АБГРУНТАВАНЫЯ ЧАКАННІ

Другі Расійска-Беларуска-Аўстрыйскі форум, які праходзіць у Мінску ў гэтыя дні, з'яўляецца важным фарматам міжнародных зносін ва ўмовах з'яўлення ў Еўропе розных інтэграцыйных фарматаў, перш за ўсё еўрапейскага і еўразійскага. Вядома, камусьці можа падасца незвычайным падбор удзельнікаў — партнёрамі па форуме велізарнай Расіі выступаюць Беларусь, якая ўваходзіць у Еўразійскі эканамічны саюз, і Аўстрыя (Еўрапейскі саюз), але менавіта ў гэтым і сэнс мерапрыемства — знайсці падставы для супрацоўніцтва, а не процістаяння ЕС і ЕАЭС.

Асабліва гэта важна ў цяперашняй сітуацыі, калі ў Еўропе фактычна складваецца абстаноўка часоў «халоднай вайны» паміж Расіяй і ЕС, а ўзаемныя санкцыі замяняюць сабой нармальныя формы дыялогу. Роля Беларусі ў развіцці кааперацыі еўразійскага і еўрапейскага інтэграцыйных праектаў удала сфармуляваў прэзідэнт Палаты эканомікі Аўстрыі Крыстаф Ляйтл, удзельнік форуму. На яго думку, «роля Беларусі — роля сувязнога звяна, свайго роду моста паміж ЕС і ЕАЭС, паміж гэтымі буйнымі інтэграцыйнымі аб'яднаннямі, каб стварацца стабільныя ўмовы функцыянавання эканомік, каб ЕС і ЕАЭС сапраўды станавіліся бліжэй».

Нагадаем, што першы трохбаковы эканамічны форум Беларусі, Расіі і Аўстрыі прайшоў 14 лістапада 2014 года ў Вене. Асноўнымі яго ўдзельнікамі былі прадстаўнікі буйнога бізнесу з усіх трох краін, а ўсяго ў яго рабоце прыняло ўдзел 170 прадпрыемстваў і арганізацый. Парадак дня ўключаў пытанні развіцця гандлёвага, вытворчага і інвестыцыйнага супрацоўніцтва краін-удзельніц.

Падчас цяперашняга форуму спектр пытанняў стаў больш спецыялізаваным, ахапіўшы найбольш важныя сферы. Асабліва ўвага надаецца энергетыцы, інфраструктуры і лагістыцы, сельскай гаспадарцы і вытворчасці прадуктаў харчавання. Немалаважныя для ўдзельнікаў форуму і перспектывы ўзаемадзеяння бізнес-асацыяцый трох краін-удзельніц.

Вядома, ёсць цікавасць і да іншых патэнцыйных сфер супрацоўніцтва. У аўстрыйскіх прадпрыемствах ёсць вялікі аўтарытэт і ў такіх галінах бізнесу, як ахова здароўя, электроніка і машынабудаванне, што цікава для Беларусі і Расіі з прычыны мадэрнізацыі эканомікі.

Важна памятаць і пра тое, што Аўстрыя, нягледзячы на адносна невялікую колькасць насельніцтва, супастаўную з беларускім, з'яўляецца буйным фінансавым цэнтрам Еўропы. Гэта звязана з імперскімі часамі, калі ў Вену, былую сталіцу спачатку Аўстрыйскай, а потым Аўстра-Венгерскай імперыі, сцякаліся велізарныя фінансавыя патокі з правінцыі. Пасля краху Аўстра-Венгерскай імперыі банкі з назапашанымі раней актывамі працягнулі паспяхова развівацца, адыгрываючы ўсё больш важную ролю ў фінансавай сістэме Еўропы.

Тое, што ў наступным годзе пройдзе і трэці форум, хутчэй за ўсё ў Расіі, не выклікае пытанняў. Гэтаму спрыяе як пазітыўная атмасфера правядзення мерапрыемства, якая абяцае рэалізацыю сур'ёзных праектаў з высокай нормай прыбытку яго ўдзельнікам, так і падбор арганізатараў. Мерапрыемствы арганізаваны Федэральнай Палатай эканомікі Аўстрыі, Беларускай і Расійскай гандлёва-прамысловымі палатамі, а гэта найважнейшыя праваднікі інтарэсаў нацыянальнага бізнесу ў сваіх краінах. Прыемна адзначыць і сур'ёзную падтрымку ў арганізацыі форуму з боку знешнепалітычных міністэрстваў усіх трох краін.

Ёсць падставы для значных пазітыўных перамен нашых адносін з ЕС. Еўрасаюз занадта доўга незаслужана сурова ставіўся да нашай краіны. А ва ўмовах, калі Беларусь набыла важнае геапалітычнае значэнне не толькі як мост паміж ЕС і ЕАЭС, але і як вельмі значная ва ўрэгуляванні ўкраінскага крызісу дзяржава, дрэнныя адносіны з Беларуссю цалкам супярэчаць нацыянальнай бяспецы краін ЕС. Ва ўмовах новых адносін, прызначаных нівеліраваць ранейшыя праблемы, узнікае шмат магчымасцяў для кааперацыі. Прыемна, што аднымі з першых імі спяшаюцца скарыстацца менавіта аўстрыйскія і расійскія бізнесмены, з якімі ў беларускіх прадпрыемствах існуе доўгая гісторыя супрацоўніцтва.

Сяргей КІЗІМА,
доктар палітычных навук

АБСЕ ацаніла выбары

належным чынам, лічыць Лідзія Ярмошына

«Магу сказаць, што Цэнтральная камісія задаволена тым заключэннем, якое прадстаўлена па выніках назірання за выбарамі з боку місіі АБСЕ», — заявіла Лідзія ЯРМОШЫНА, старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі.

Паводле слоў Лідзіі Міхайлаўны, учора адбылася яе сустрэча з кіраўнікамі місіі АБСЕ, бо ў той спыняюцца паўнамоцтвы маніторынгавай місіі і неўзабаве яны пакінуць Мінск. «Падчас сустрэчы мы абменяліся ўражаннямі ў дачыненні да працэсу назірання і працэсу выбараў і, у прынцыпе, намецілі перспектывы працы на будучыню. Я падзякавала супрацоўнікам місіі, яе кіраўніцтву за спробу бачання аб'ектыўнасці тых падзей, якія адбываюцца ў нашай краіне», — пракаментавала сустрэчу старшыня ЦВК.

Яна адзначыла станоўчую тэндэнцыю ацэнкі місіяй беларускіх выбараў: «За доўгія гады міжнароднага назірання менавіта з боку місіі АБСЕ ў нашай краіне мы ўпершыню атрымалі справаздачу, якая змяшчае высновы і пералічвае падзеі не толькі з адмоўнага боку, але і адзначае шмат станоўчага». І дадала: «Гэтым трэба ганарыцца».

«Быў адзначаны як вельмі добры працэс галасавання на 95% участкаў, дзе былі міжнародныя назіральнікі. Хацела б падкрэсліць, што гэта вельмі высокая ацэнка менавіта працэдуры галасавання. Так, былі адзначаны недахопы, звязаныя з празрыстасцю, дакладнасцю працы ўчастковых выбарчых камісій у момант падліку галасоў. Тым не менш колькасць выпадкаў, дзе члены місіі выказалі заўвагі, зменшылася ў параўнанні з парламенцкімі выбарамі 2012 года», — паведаміла Лідзія Ярмошына. Яна падкрэсліла, што «члены місіі АБСЕ стараліся працаваць аб'ектыўна». На думку старшыні ЦВК, у гэтым ёсць заслуга і саміх беларусаў. «Нашы арганізатары выбараў на месцах усямерна прыкладалі намаганні да таго, каб працэдура выбараў была максімальна адкрытай, падлік галасоў сумленным, а назіральнікі сапраўды зрабілі свае аб'ектыўныя заключэнні», — сказала яна.

Лідзія Міхайлаўна звярнула ўвагу на тыя станоўчыя моманты, якія канстатавала місія. Паводле яе слоў, гэта абстаноўка, якая была ў краіне напярэдадні выбараў, добразычлівасць і адкрытасць усіх членаў выбарчых камісій, іх супрацоўніцтва з членамі місіі, а таксама выдатная праца сродкаў масавай інфармацыі, якія без цэнзуры прадстаўлялі магчымасць вядзення перадвыбарнай агітацыі кандыдатам у прэзідэнты. Акрамя таго, у заключэнні гаворыцца, што агітацыйная кампанія ў апошнія два тыдні праводзілася кандыдатамі на добрым узроўні, чаму ўсяляк спрыялі мясцовыя ўлады.

КАМПЕТЭНТНА

Старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Расійскай Федэрацыі Яўген ЧУРАЎ, які знаходзіўся ў Беларусі падчас выбараў у якасці міжнароднага назіральніка, наступным чынам пракаментаваў папярэднія вынікі выбараў:

— Хацеў бы звярнуць увагу на два важныя факты, якія, з аднаго боку, пацвярджаюць наяўнасць у Рэспубліцы Беларусь апазіцыйных настрояў, з іншага боку, яны пацвярджаюць сумленнасць праведзеных выбараў. Першае: графа — «супраць усіх». 7% — гэта нямала. І другое: вынікі галасавання ў Мінску, якія кантрасна адрозніваюцца ад галасавання ў цэлым па краіне. Прытым, што і вынікі галасавання ў цэлым па краіне былі зразумелыя для палітолагаў загадзя, гэтаксама былі зразумелыя для палітолагаў, як беларускіх, так і замежных, вынікі галасавання па Мінску. Агучаныя ў ноч на панядзелак звесткі пацвярджаюць сумленнасць падліку галасоў на гэтых выбарах.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА. *medvedeva@zviazda.by*
Вераніка ПУСТАВІТ. *pustavit@zviazda.by*

ПЛАНЫ ЭКС-КАНДЫДАТАЎ

Падводзяць вынікі выбараў і тыя, хто ўдзельнічаў у барацьбе за прэзідэнцкае крэсла. Прынамсі, ужо экс-кандыдаты падзяліліся з журналістамі сваімі планамі на будучыню.

Лідар Ліберальна-дэмакратычнай партыі Беларусі Сяргей Гайдукевіч цалкам згодны з усімі агучанымі ЦВК лічбамі. Палітык дадаў, што Беларусь будзе і далей развівацца спакойна, без узрушэнняў.

— Са свайго боку я асабіста і партыя плячо падставім у гэты складаны час. Калі спатрэбіцца, пойдзем туды, куды Радзіма скажа, — паабяцаў Сяргей Гайдукевіч.

У пацвярджэнне гэтых слоў кіраўнік ЛДПБ паведаміў, што ўжо ў лістападзе яго партыя пачынае парламенцкую кампанію.

Таццяна Караткевіч расказала, што не завяршае сваю палітычную дзейнасць і плануе працягнуць яе падчас найбліжэйшых парламенцкіх выбараў. На пытанне: «Ці будзеце вы балатавацца падчас парламенцкіх выбараў?» Таццяна Караткевіч адказала: «Так, буду».

«Трэба прызнаць, што шмат людзей падтрымлівае дзейную ўладу», — сказала экс-кандыдат у Прэзідэнты.

Мікалай Улаховіч прызнае вынікі прэзідэнцкай кампаніі 2015 года і лічыць, што дзейны кіраўнік дзяржавы з вялікім адрывам апярэдзіў іншых кандыдатаў заслужана. Пры гэтым ён заявіў аб намеры зрабіць Беларускую патрыятычную партыю, якую ён узначальвае, значнай сілай у беларускім грамадстве. «Мы, напэўна, няправільна рабілі акцэнт. Пераглядзім свой статут, у нас з'явіліся маладыя новыя сілы, і я думаю, што і Сяргей Гайдукевіч пазайздросціць маім хлопцам, якія будуць займацца партыйнай дзейнасцю», — сказаў Мікалай Улаховіч, маючы на ўвазе лідара ЛДПБ і свайго канкурэнта на выбарах.

Вераніка ПУСТАВІТ. *pustavit@zviazda.by*

■ Святло ў акне

ЛЮБОВІ ХАПАЕ НА ЎСІХ

Яна не вымяраецца запісам у пашпарце

20 шматдзетных маці атрымалі высокую ўзнагароду — ордэн Маці — з рук старшыні Мінскага абласнога камітэта Сямёна Шапіры. Адной з іх стала Любоў Чагіна, маці пяці ўласных дзяцей, і шасці прыёмных. Вялікая сям'я Чагіных жыве ў пасёлку Крынічны ў дзіцячай вёсцы «Вытокі». Іх трохпавярховы катэдж абкружаны сасновым борам. У дварыстуць ружы і пахне грыбамі... А літаральна пяць гадоў таму яны ўдзесяцёх жылі ў мінскай трохпакаёўцы...

ДАПАМОГА — ГЭТА ДАБРАВОЛЬНАЯ МІСІЯ

— Калі ў нас было трое дзетак: Ангеліна, Валера і Руслан, мы жылі ў зусім маленькай кватэры, — распавядае маці-гераіня. — З цягам часу як шматдзетная сям'я пабудавалі трохпакаёўку, і нам здалося, што там занадта шмат месца — вырашылі ўзяць яшчэ дзіця. Першымі прыёмнымі дзецьмі якраз пасля Новага года сталі 3-гадовая Ганначка і яе гадавалы брат Жэня. Пасля з'явіўся 13-гадовы Валік. Праз нейкі час я даведалася, што ў доме дзіцяці ёсць маленькі хлопчык. Я доўгі час наведвала яго ў бальніцы, — так у нас з'явіўся 7-месячны Ігар, а праз год — 2-месячная Кіра, яго сястрычка. Тры гады назад абое малыя сталі нашымі роднымі дзецьмі. Затым у сям'ю прыйшлі 7-класніца Ганна і яе брат першакласнік Сяргей. Пасля з'явілася Марта, а ў канцы мінулага навучальнага года — Света і Таня.

Далейшы лёс сям'і склаўся так, што пляменнік Любові трапіў у прытулак. Хлопчык вельмі хацеў жыць з цёткай, але ж забраць яго адзінаццатым у кватэру было немагчыма ўжо проста фізічна. Якраз на той момант была створана дзіцячая вёска «Вытокі» ў Бараўлянах, і прыёмныя бацькі сталі там бацькамі-выхавальнікамі, забраўшы да сябе 14-гадовага пляменніка Уладзіка.

— Я вельмі люблю дзяцей. Мне шкада, калі яны апынаюцца ва ўмовах, што іх няма каму абараніць. Была б у мяне магчымасць, я ўсынавіла б усіх сваіх дзяцей, — расказала Любоў. — Усе яны ведаюць, што любоў не вымяраецца запісам у пашпарце, яны проста адчуваюць яе кожны дзень.

— Гэта яе місія, напэўна, — дапамагаць людзям, яна ўсіх шкадуе, — дадае галава вялікага сямейства Дзмітрый Чагін.

Магчыма, такое жаданне дапамагаць сфарміравалася ў жанчыны яшчэ ў дзяцінстве. Хаця ў сям'і яе бацькоў было толькі двое дзетак (яна ды брат), доўгі час там знаходзілася стрыечная сястра Надзея, якая засталася без маці ў 16 гадоў.

— У мяне заўжды перад вачыма быў прыклад, што ёсць чалавек, якому патрабуецца дапамога, магчыма, таму я і прывыкла дапамагаць, — разважае Любоў Мікалаеўна. — Адносіны ў маёй уласнай сям'і будуюцца выключна на ўзаемнай павазе. Амаль усе дзеці называюць мяне мама, акрамя Тані і Светы, якія яшчэ не прывыклі да мяне з мужам. Шмат хто сустракаецца са сваімі роднымі бацькамі, сазвоньваецца з імі па тэлефоне. Мне так цікава чуць, як яны кажуць: «Мама, ты прыедзеш? Мне мама сказала, што цябе чакае».

БАЦЬКА І МАЦІ Ў ВАЧАХ ДЗІЦЯЦІ

У вольны час дзеці любяць глядзець кіно, гуляць у настольныя гульні, спяваць у караоке.

Ганна любіць чытаць. Ангеліна вучыцца іграць на гітары, займаецца плаваннем, тэнісам, пачынала прафесійна займацца акрабатыкай, на ўсіх спаборніцтвах бегае за клас. Света добра малюе. Валера пляце з бісеру, танцуе брэйкданс. Руслан займаецца паркурам, спартыўным арыентаваннем. Марта вяжа кручком і робіць шмат сваімі рукамі.

Старэйшыя дзяўчаты ўжо паціху трэніруюць малых. Кіра як сапраўдная гімнастка дэманструе мне расцяжку ў шпагаце, а Ігар цудоўна малюе гуашшу.

— Самы вялікі аматар спеваў — мама, — выдае сакрэт Ангеліна. — Яна таксама добра шые і вяжа. На ўсе навагоднія ранішнікі стварае касцюмы сама, Ігар вось быў у мінулым годзе астролагам. Кіры нядаўна звязала кофту, а тата атрымаў цёплыя шкарпэткі.

— Тата вельмі добра і смачна гатуе. Яго каронная страва — плоў, які я вельмі хачу навучыцца гатаваць, — дзеліцца Ганна. — У мамы — гэта тварожныя пончыкі. І ўсе мы, хто старэйшы, умеем гатаваць мяса па-французску, мама навучыла.

Гатуюць, прыбіраюцца і адпачываюць Чагіны ўсе разам. У кожнага за сталом сваё месца.

— Мы гатуем у звычайных 6-літровых каструлях. Усё з'ядаецца адразу, назаўтра гатуецца новае. Мне вельмі дапамагаюць дзяўчаты, таму я не адчуваю, што аддаю кухні шмат часу. Яны ўсё ўмеюць: бліны смажаць, курыцу запякаюць, суп вараць. Руслан, які цяпер вучыцца ў БНТУ і жыве ў інтэрнаце, мне звоніць і пытаецца: «Мама, я не разумею, як мне гатаваць на аднаго? Колькі солі трэба і вады, каб макароны зварыць?» — смяецца Любоў Мікалаеўна.

Валік цяпер жыве самастойна, але прыязджае да бацькоў на ўсе святы і выхадныя. Маці Ганны і Сяргея праз 1,5 года пасля пазбаўлення яе бацькоўскіх правоў, выправілася і аднавіла свой статус, нарадзіла яшчэ адну дзяўчынку. Хлопчык зараз жыве з ёю. 16-гадовая Ганна, якой на той момант было 14 гадоў, вырашыла застацца з новай маці. З абедзьвюма ў яе добрыя адносіны.

МАРСКІЯ ПРЫГОДЫ

Калі Чагіны кудысьці выязджаюць на адпачынак, стараюцца рабіць гэта ўсёй сям'ёй — проста ездзяць у два рэйсы.

— Прыязджаем мы, напрыклад, на Мінскае мора, з вады толькі і чуваць: «Мама, я тут!», «Мама, паглядзі, куды я заплыў!». І калі так крычаць усе па парадку, то іншыя адпачывальнікі пачынаюць азірацца, дзе ж тая мама, у якой столькі плыўцоў, — дзеліцца гісторыямі Любоў.

Маці-гераіня вельмі баіцца вады, таму перажывае, каб дзеці не адплывалі далёка. На адпачынку ў Сочы ў 2008 годзе здарыўся выпадак, які стаў для яе сапраўдным шокам.

— Мы адправіліся ў марское падарожжа на катары з Ангелінай і Русланам. Спыніліся пасярод мора, дзецям раздалі камізэлькі і прапанавалі паплаваць. І мае дзеці, не пытаючыся нічога, нацягнулі гэтыя камізэлькі і ўскочылі ў ваду. Я сама не ўмею плаваць, і была ў такой істэрыцы, што проста пачала крычаць, як убачыла гэта. А яны мне з вады адказваюць: «Мама, нам камізэлькі перашкаджаюць плаваць. Можна мы іх здымем?» Да берага вярталіся яны на надзьмутым крузе, які быў прычэплены да катара. У выніку дзеці адпачылі, а мама ледзьве не захварэла, — успамінае Любоў, якая цяпер успрымае гэта ўжо як жарт. З часам яна прызвычаілася, што ўсе яе дзеці рухавыя, смелыя і няўрымслівыя і з гэтым трэба проста мірыцца.

Ірына СІДАРОК, фота аўтара

СПАЧАТКУ БЫЛА... МАМА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Святлана ШУТАВА, старшыня Магілёўскай абласной арганізацыі «Беларускі саюз журналістаў»:

— За ўсё, што ёсць ува мне добрага, я ўдзячна сваёй маці — Валянціне Іванаўне Высоцкай. Яна для мяне настаўніца ва ўсім. Менавіта яна навучыла мяне чытаць. Нават памятаю першае слова, якое я самастойна прачытала, — «барабан». Яно было даволі складаным для такой маленькай, як я, але ж скарылася. І мне было вельмі радасна ад гэтай перамогі.

Маці заўсёды з'яўлялася для мяне прыкладам самаахвярнасці і таго, як трэба любіць бліжняга свайго. Ад яе вучылася паважаць старэйшых. Ніколі не бачыла, каб яна проста ляжала на канапе і нічога не рабіла. Працавала і мне нагадвала, што без працы нічога не атрымаецца. Таму з дзяцінства я ўсвядоміла: бясплатны сыр бывае толькі ў пастцы. Калі хочаш чагосьці дасягнуць у жыцці, трэба працаваць. Маці і сёння, нягледзячы на ўзрост, ні хвіліны не сядзіць на месцы

Мама заўсёды была і ёсць для мяне аўтарытэт.

Наталля АЎДЗЕЕВА, старшыня Цэнтральнага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў культуры:

— Невыпадкова кажуць, што мы родам з дзяцінства: з малаком маці ўбіраем у сябе адносіны да навакольнага свету, асэнсоўваючы напачатку сябе неад'емнай часткай Мамы. У маім жыцці гэта было і (дзякуй Богу) ёсць да гэтага часу менавіта так. Мая матуля Жаннета Іванаўна Сільчанка выраслаў беднай сям'і. Вучылася і працавала — за пяцярых! У выніку ад фабрычна-заводскай дзяўчынкі паднялася да высокай пасады аднаго з самых прэстыжных банкаў краіны. Пры гэтым ніколі «не хварэла» на снабізм, пры ўсёй патрабавальнасці да сябе і людзей.

А якая яна сярод сяброў і родных! Цудоўна спявае, мае тонкае пачуццё гумару... Нас з сястрой гэтаму вучыла, умудралася па вечарах і выхадных ладзіць у родным завулку на Чапаеўцы (ускраіна Магілёва) спартыўныя баталіі... І заўсёды паважала ў кожным з нас асобу.

Добрага здароўя табе, мамачка! Добрага здароўя ўсім-усім матулям! І светлая памяць тым з іх, хто ўжо глядзіць на сваіх дзяцей з Нябёсаў.

Сяргей ЛАГУЦЕНКА, мастацкі кіраўнік Гомельскага абласнога драматычнага тэатра, акцёр:

— Маці для мяне — як вера. Пра яе таксама нельга гучна размаўляць. Калі бегаць і крычаць, як ты верыш, цябе западозраць ці ў хлусні, ці ў фальшы. Не словы, а ўчынкі вызначаюць нашы адносіны, у тым ліку да матулі. Тое, што я раблю, — гэта дзеля мамы.

Памятаю, у дзяцінстве мы ехалі ў вёску ў машыне з будкай. Раптам пачаўся ліўень, навальніца і вельмі моцны вецер. Машыну гайдала, і фанерку ў акенцы выбіла ветрам. Маці тады стала і сваім целам увесь час закрывала гэтую адтуліну, каб нас з братам абараніць ад стыхіі.

Маці заўсёды хацела, каб у мяне была вышэйшая адукацыя. Але казала: можаш быць кім заўгодна, галоўнае — каб чалавекам нармальным.

Аляксей СКАКУН, старшыня СВК «Астрамечава» Брэсцкага раёна, доктар эканамічных навук:

— Мая мама Вера Пракопаўна выхоўвала нас найперш сваім прыкладам: яна заўсёды шмат працавала. Пасля вайны жылося цяжка, і, каб пракарміць сям'ю, вясковаму жыхару трэба было шчыраваць у полі ад цямна да цямна. Памятаю, мама жала жыта, а я зусім малым дапамагаў вязаць снапы. Потым паступова асвоіў усе тонкасці мужчынскай працы: касьбы, ворыва, малацьбы. Праз шмат гадоў, калі абазначыліся пэўныя поспехі ў рабоце і мяне сталі заўважаць, са мной лічыцца, прыйшло ўсведамленне, што падмурак гэтаму закладзены мамай.

Сяргей КАЛЯДА, намеснік старшыні грамадскага аб'яднання «Рэспубліканскі турысцка-спартыўны саюз» (Гродна):

— Мама, выкладчыца замежнай мовы, была маім класным кіраўніком. Яна ж аддала мяне ў музычную школу. Займаўся па класе баяна. Аднак усё часцей у чахле замест музычнага інструмента сталі аказвацца... кеды і мяч. А пазней мной моцна авалодала цяга да турыстычных вандровак. Пэўна, маме гэта не надта падабалася, даводзілася шмат чуць, што на першым месцы павінна быць вучоба. Але ўсё ж яна паказала прыклад павагі да мяне як асобы. Па сёння захоўваю маміна разважанне на кавалку паперы: «Чаму мой сын ходзіць у горы? Напэўна, хоча перамагчы сябе ў першую чаргу».

Аляксандр МАХАНЬКОЎ, акцёр віцебскага «Беларускага тэатра «Лялька»:

— Маёй маці Марыі Міхайлаўне 80 гадоў. Зараз яна жыве ў Багушэўску (гарадскі пасёлак у Сенненскім раёне. — **Аўт.**). А раней жыла ў гарадку Баранькі Аршанскага раёна. Там працавала на заводзе ў аддзеле тэхнічнага кантролю. Мужчыны рабілі дэталі, а яна якасць прадукцыі правярала. Мой старэйшы брат жыве далёка, а я, калі ёсць магчымасць, наведваю маму.

Наконт урокаў, якія я атрымаў ад мамы... Ды ўсяму яна мяне навучыла! Напрыклад, хадзіць у лес у грыбы і ягады. Калі яна кухарыла і трэба было ёй дапамагчы, гэта было весела. Усё рабіла яна лёгка, і побач з ёй заўсёды нешта рабіць было прыемна. Пры гэтым яна ўмела мяне падхвальваць. І ў выніку гэта спрыяла таму, што ўсё хацелася рабіць лепей.

Віктар ШНІП, паэт, галоўны рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура»:

Кожны вечар перад сном, а потым раніцай, збіраючыся на працу, гляджу, як на абразы, на партрэты бацькоў, што вісяць у маім пакоі. У мяне нядаўна напісаўся верш:

Тата і мама глядзяць на мяне
З рамак партрэтных на хатняй сцяне.
Тата і мама — іконы мае.
Вас мне жывых, як святла, нестае
Тут на зямлі, дзе заўсёды святло
Нават у тым, што ў нябыт адышло...

У мяне шмат вершаў пра маму. На жаль, я іх напісаў, калі яе не стала. Цяпер для мяне дзень нараджэння мамы — гэта і мой дзень нараджэння, бо з нараджэннем маці нараджаемся і мы, яе дзеці. Беражыце сваіх МАТУЛЬ!

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.
Аляксандр ПУКШАНСКІ.
Ірына АСТАШКЕВІЧ.
Святлана ЯСКЕВІЧ.
Барыс ПРАКОПЧЫК.
Дзіяна СЕРАДЗЮК.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

14 кастрычніка 2015 г.
№ 19 (359)

ЖЫЛЛЁ

КАЛІ ЗНОСЯЦЬ ДОМ...

На якую кампенсацыю могуць разлічваць уласнікі прыватных сядзіб?

Знаёмая нядаўна плакалася: іх прыватны дом у Мінску, ля станцыі метро Міхалова, ідзе пад знос, таму нядаўна давялося пераязджаць у кватэру ў іншым раёне... Шчыра прызнацца, мне самой стала шкада той мілы дамок з размаляванымі сценамі, у якім не раз даводзілася гасцяваць, — увесь ахінуты старымі грушамі і яблынямі, што захілялі яго ад шумнага горада. Аднак настальгія і прывязанасць да роднай хаты — не адзіная і не самая галоўная прычына, чаму людзі не жадаюць мяняць сваю хоць і старую, але прыватную сядзібу на жыллё ў шматкватэрным доме.

«Не хачу ў Каменную Горку!»

На месцы прыватных забудоў у сталіцы імкліва паўстаюць шматпавярховікі на сотні кватэр. На тэрыторыі, дзе раней жылі некалькі сем'яў, цяпер хутка вырастае хмарачос, у які можна засяліць цэлую вёску, а часам і не адну... Сітуацыя ў Маскоўскім раёне сталіцы ў гэтым плане найбольш паказальная: практычна ўся яго тэрыторыя ахоплена зносам прыватных жылых дамоў. Паводле планаў, у розныя тэрміны тут ліквідуюць амаль 1000 сядзіб. Калі быць больш дакладнымі, то да 2030 года з яго карты знікнуць 924 прыватныя дамы, паведаміла **намеснік начальніка ўпраўлення архітэктуры і будаўніцтва Маскоўскага раёна Ларыса БЫСТРАЯ**.



— На тэрыторыі, якая падлягае асваенню са зносам жылых дамоў, распрацоўваюцца горадабудаўнічыя пашпарты. Гэтыя ўчасткі ў перспектыве выстаўляюцца на аўкцыён — яго пераможца і займаецца рэалізацыяй маёмасных правоў уласнікаў дамоў, якія зносяць.

У адпаведнасці з Указам Прэзідэнта №58 («Аб некаторых пытаннях адабрання і прадастаўлення зямельных участкаў». — **Аўт.**) забудоўшчык прапануе ўласнікам дамоў выказаць свае пажаданні наконт будучага жылля. Напрыклад, гэта можа быць кватэра тыпавых спажывецкіх якасцяў, зямельны ўчастак за межамі горада альбо грашовая кампенсацыя. Ацэнку аб'ектам, якія зносяць, на падставе тэхнічнай дакументацыі дае праектны інстытут «Белдзіпразем», які і вызначае колькасны эквівалент кампенсацыі. Пры жаданні перасяліць з дамоў у кватэры людзей могуць у любы раён у межах сталіцы. Які менавіта — гэта ўжо кожны жыхар канкрэтнага дома сам вырашае з забудоўшчыкам.

— Сёння да ўвагі не прымаюцца заўвагі накшталт «я жыву тут, а вы мне даяце жыллё ў Каменнай Горцы», — адзначае Ларыса Быстрая.

Адметна, што часцей за ўсё з прапанаваных варыянтаў кампенсацыі жыхары раёна выбіраюць усё ж кватэры.

Між тым не ўся прыватная забудова раёна суцэльна пойдзе пад знос. Напрыклад, цалкам захаваюць вуліцу Курганную. Таксама захаваецца частка Паўночнага завулка, які з'яўляецца зонай гістарычнай забудовы. У перспектыве дамы тут плануюць адрэстаўраваць, аднак людзей з іх усё адно выселяць. Акрамя таго, часткова захаваюць дамы ў раёне вуліцы Вавілава і завулка Паўзунова.

— Гэта ў нас адбываецца ў адпаведнасці з горадабудаўнічым праектам дэталёвага планавання ў межах вуліц Соф'і Кавалеўскай — Мініна — Машыністаў — чыгункі. Частка дамоў на гэтай тэрыторыі зносіцца, частка захоўваецца, — тлумачыць Ларыса Быстрая.

Самабуд не ўлічаць

Канфлікты забудоўшчыкаў з жыхарамі, якія не жадаюць пакідаць свае дамы, узнікаюць з розных прычын. Не ўсіх задавальняюць варыянты жылля, якое прадастаўляецца ўзамен. Але не толькі гэта становіцца галоўнай тэмай непаразуменняў.

— Бывае, што ў людзей на ўчастку ёсць самавольныя збудаванні, не зарэгістраваныя ва ўстаноўленым парадку. Магчыма, яны былі ўзведзены ў 1990-я гады, 1980-я. Як правіла, узнікаюць канфліктныя сітуацыі, калі ёсць самабуд, і людзі хочуць, каб ім далі жыллё з яго ўлікам, — гаворыць спецыяліст.

Аднак забудоўшчык, кіруючыся заканадаўствам, выдзяляе жыллё ў адпаведнасці з тэхнічным пашпартам, без уліку самавольных збудаванняў. Таму і ўзнікаюць непаразуменні, якія, бывае, даходзяць і да судовых разбораў. Аднак у большасці вынікаў падобныя пытанні ў судзе вырашаюцца не на карысць уласніка жылля.

Яшчэ адна сітуацыя — калі людзей не задавальняюць варыянты прадастаўлення жылля. У такіх выпадках забудоўшчыкі стараюцца знаходзіць кампрамісы. Калі не знаходзяць, прымаць рашэнне зноў даводзіцца суду — як правіла, з ініцыятывы забудоўшчыка. Пры гэтым афармляецца пратакол рознагалоссяў паміж уласнікам і забудоўшчыкам, дзе ўласнік павінен указаць канкрэтныя прычыны сваёй нязгоды з прапанаванымі варыянтамі жылля.

70% сядзіб захаваюць

Як паведаміў **галоўны архітэктар УП «Мінскграда» Аляксандр АКЕНЦЬЕЎ**, згодна з Генеральным планам горада, распрацаваным сёлета, цалкам захаваецца каля 70% тэрыторый, на якіх размешчаны сядзібы. Паводле Генплана 2010 года, цалкам захоўвалася толькі 28% сядзібных тэрыторый. Астатняя частка прызначалася пад знос або рэканструкцыю па прынцыпе змяшанай забудовы з «украпінамі» шматпавярховага жылля.

Пад знос і далейшую трансфармацыю ў шматпавярховую жылую або грамадскую забудову пойдуць сядзібныя масівы, якія прымыкаюць да галоўных гарадскіх праспектаў. Таксама знікнуць усе сядзібы ў цэнтры горада, унутры другога транспартнага кольца. Падрабязная інфармацыя аб планах па зносе сядзібнай забудовы размяшчаецца на сайтах адміністрацый раёнаў.

Дзіяна СЕРАДЗЮК. *seradzyuk@zviazda.by*

Фота Аляксея ПІШЧЫКА.

ЯК НАПОЎНІЦЬ МАЛОЧНЫЯ РЭКІ?

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ

У вёсцы Даўгінава, што ў Вілейскім раёне, я была гадоў пяць таму: наведала населены пункт па просьбе мясцовых жыхароў, якія скардзіліся, што малаказборшчыца разбаўляе малако вадой, ды і наогул увесь час заніжаецца працэнт яго тлустасці.

Пабываўшы тады на Вілейскім малаказаводзе, упэўнілася, што паказчыкі тлустасці малака ва ўсіх, хто здае яго з уласных падворкаў, як пад грэбень практычна аднолькавыя: 2,1—2,5%. Але такога насамрэч не магло быць! Ведала гэта з асабістага вопыту, паколькі выраслa ў вёсцы, а таксама ў свой час працавала на малочнатаварнай ферме падлікоўцам малака. Тлустасць яго залежыць ад пароды, індывідуальных якасцяў каровы, рацыёну і структуры кармоў, догляду, пары года. Нават стрэсы могуць уздзейнічаць на колькасць тлушчу ў малацэ...

Пасля публікацыі мне патэлефанавалі даўгінаўцы з падзякай: нарэшце ў нас навялі парадак. Малако з падворкаў пачаў збіраць індывідуальны прадпрымальнік, вельмі прыстойны чалавек, тлустасць малака ён вымярае на месцы індывідуальным прыборам, працэнт яе значна павысіўся. У выніку людзі сталі атрымліваць за здадзеную прадукцыю больш грошай. У вёсцы пачаўся ажыятаж: некаторыя жыхары, што не мелі каровы, купілі яе, у каго было дзве — абзавяліся трэцяй і нават чацвёртай....

І вось зноў званок з Даўгінава, зноў нараканні на тлустасць...

Станіслава Дударэвіч працавала ветэрынарным урачом у калгасе. Цяпер яна на пенсіі. Свойскую жывёлу трымала заўсёды, не адмовілася ад яе і сёння: у яе чатыры дойныя каровы і цялушка!

— Раней не было ніякіх пытанняў, тлустасць малака задавальняла. А цяпер мне, напрыклад, ставяць толькі базавую — 3,6%. Шмат губляю ў грошах. Але ж восенню тлустасць заўсёды вышэйшая. Я пакідаю для сябе ранішні надой, дык амаль што паўвядра смятаны збіраю.

> Як ішло вялікае малако, то за 10 дзён атрымлівала за здадзенае 2,5 млн рублёў, цяпер за дэкаду выходзіць паўтара мільёна.

— А як з кармамі? Самі нарыхтоўваеце? — пацікавілася ў Станіславы Станіслававны.

— Цялят здаём у ААТ «Даўгінава», атрымліваем паўтара кілаграма збожжа за кілаграм жывой вагі і паўтары тоны сена (раней давалі па 3 тоны). Але гэтага малавата, каб пракарміць жывёлу: самі залужаем участак, апрацоўваем, косім траву, — адказвае яна. — Дзякуючы сваёй гаспадарцы я вывела ў людзі траіх дзяцей, усім дала вышэйшую адукацыю... Цяпер жа асабліва не дапаможаш, прыбытак ад малака ёсць, але не надта вялікі, — уздыхае жанчына.

Для Раісы Ніжнік, якая трымае дзвюх кароў, рагулі — сэнс жыцця. Сама не паесць, пакуль не заменіць ім падсцілку, не падоіць, не накорміць.

— Я па спецыяльнасці заатэхнік, таму ведаю, чым карміць жывёлу, каб было добрае і якаснае малако: даю канюшыну, уводжу ў рацыён кармавыя дабаўкі, у прыватнасці, філуцэн. — Мая дачка працуе на прадпрыемстве, дзе выпякаюць вафельныя стаканчыкі для марожанага. А для іх прыгатавання выкарыстоўваюцца мука першага і вышэйшага гатункаў, соль, алей. Крошкі, адходы можна выпісаць па прымальным кошце, — дык вось гэтай смакатой я частую сваіх гадаванцаў. І няўжо пры такіх кармах можа быць тлустасць толькі 3,6%? Раней жа выстаўлялі ад 3,8 да 4,6%.

Намеснік начальніка мясцовага паштовага аддзялення Тамара Казуля спачатку трымала дзвюх кароў. Калі дачка паступіла вучыцца, набыла яшчэ дзвюх.

— Як ішло вялікае малако, то за 10 дзён атрымлівала за здадзенае 2,5 млн рублёў, цяпер за дэкаду выходзіць паўтара мільёна, — падзялілася са мной жанчына. — Вядома, гэта добрая прыбаўка да сямейнага бюджэту. Але ж... шмат губляю на тлустасці: не дацягвае чамусьці да базавай. Атрымліваецца, чым больш здаеш малака, тым больш недабіраеш грошай.

Валянціна Більдзюг, як і папярэднія мае суразмоўцы, на пенсіі, але працягвае працаваць прадаўшчыцай у краме.

— Пакуль збываць сваю карміцельку не збіраюся, хоць базавай тлустасці не ставяць, — кажа яна. — Разумею, што не можа быць усё ідэальна. Але ж павінна быць нейкая сістэма.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

НА ПАРАДКУ ДНЯ

КАГО ЧАКАЕ РЫНАК ПРАЦЫ

Магілёўскія дэпутаты разгледзелі пытанне занятасці насельніцтва

Неаднойчы даводзілася быць сведкай, як на суботнія тэлефонныя лініі ў органы выканаўчай улады раз-пораз звярталіся беспрацоўныя грамадзяне — у спадзяванні, што ім дапамогуць знайсці месца працы. Некаторыя нават і не раз. Гэтую трывогу ў выканкамах разумелі і цярпліва прапаноўвалі варыянты. Нават у тых сітуацыях, калі суіскальнік ставіў умову: працаваць жадаю выключна па спецыяльнасці.

Па сутнасці, кожны чалавек сам каваль свайго шчасця. Але сітуацыя на рынку працы сёлета і сапраўды складаная. Спачатку эканамічны крызіс у Расіі прымусіў вярнуцца дамоў частку занятых там нашых суайчыннікаў. Потым прыняты ў Беларусі закон аб утрыманстве актывізаваў насельніцтва. Адначасова павялічыўся паток бежанцаў з Украіны... Між тым на 1 верасня ў Магілёўскай вобласці быў адзін з самых нізкіх у краіне паказчыкаў па беспрацоўі — 1,1%. Пры прагнозе 1,5%.

Што было зроблена сёлета для таго, каб людзі нават у складаных для пошукаў умовах змаглі знайсці працу? Гэта пытанне стала адным з галоўных для разгляду на сесіі Магілёўскага аблсавета дэпутатаў.

Сітуацыя пад кантролем

На працягу 8 месяцаў у органы па працы, занятасці і сацыяльнай абароне звярнуліся ў пошуку працы 24,8 тысячы жыхароў — на 12,4% болей, чым за аналагічны перыяд летась.

Прырост беспрацоўных атрымаўся за кошт былых будаўнічых кадраў, попыт на якія знізіўся ў параўнанні з мінулым годам амаль на 40%. Найбольш адчувальна гэта балючая сітуацыя адбілася на Магілёве, Бабруйску, Глускім, Клімавіцкім, Горацкім, Крычаўскім і Асіповіцкім раёнах.

З прычыны эканамічнага становішча ва ўмовах няпоўнай занятасці вымушаны былі працаваць работнікі «Белшыны», Асіповіцкага завода аўтамабільных агрэгатаў, Бабруйскага завода трактарных дэталяў і агрэгатаў, Магілёўтрансмаша, «Строммашыны», «Вяснянкі» і іншых. Закладнікамі нявпростай сітуацыі ў першай палове года стала 23,7 тысячы чалавек. Ліхаманіла ў большасці прадпрыемствы апрацоўчай галіны рэспубліканскай формы ўласнасці. Сітуацыя абвастрылася праз адсутнасць абаротных сродкаў і сыравіны, заказаў на прадукцыю, зніжэнне спажывецкага попыту, наяўнасць складскіх запасаў.

— Каб стабілізаваць становішча, у вобласці адбываўся маніторынг рынкаў працы, вынікі якога разглядаліся на планёрках аблвыканкама, гар- і райвыканкамаў, — паведаміла **старшыня Камітэта па працы, занятасці і сацыяльным абслугоўванні Магілёўскага аблвыканкама Святлана ТАРАСЕНКА**. — У маі на ўсіх узроўнях выканаўчай улады ўздымалася пытанне аб своечасовай выплаце заробкаў і недапушчальнасці пагаршэння становішча на рынку працы. На прадпрыемствах, дзе склалася цяжкае эканамічнае становішча, праводзіліся кансультацыі па пытаннях працоўнага заканадаўства і мерах сацыяльнай падтрымкі, працавалі «гарачыя лініі».

Узмацнілі маніторынг

Як паказаў комплекс кантрольных мерапрыемстваў, арганізаваны Камітэтам дзяржкантролю па Магілёўскай вобласці, наймальнікі шэрагу прадпрыемстваў і арганізацый наўмысна замоўчвалі інфармацыю пра вакансіі. Напрыклад, кіруючая кампанія холдынгу «Аграмашсэрвіс» не палічыла патрэбным падзяліцца з органамі працы і занятасці звесткамі аб наяўнасці больш чым 20 вакантных месцаў. Яшчэ больш мудрагелістую схему практыкаваў Магілёўскі мясакамбінат, дзе пасля звальнення чарговага работніка вакансію проста скарачалі. Кантралёры выявілі, што такім чынам летась было скарочана 160 пасад. Але кіраўніцтва прадпрыемства нават не папярэдзіла аб гэтым службу занятасці. Вінаватых чакае адміністрацыйная адказнасць.

Каб папярэдзіць такія факты, у вобласці ўзмацнілася спагнанне з наймальнікаў за своечасовасць прадстаўлення звестак пра вакансіі. З кіраўнікамі праведзена больш за 150 семінараў, адбылося 36 кірмашоў вакансій. Як вынік — з сакавіка па верасень колькасць месцаў для працаўладкавання ўзрасла з 2697 да 3514.

Спецыялісты органаў па працы і занятасці звяртаюць увагу ўрада краіны на тое, што наспела неабходнасць надаць ім права самастойна ажыццяўляць кантроль (маецца на ўвазе Указ №510), каб своечасова выяўляць падобныя факты.

Праграмісты і трактарысты — у дэфіцыце

Па інфармацыі Мінпрацы і сацыяльнай абароны, рабочых кадраў у Беларусі па-ранейшаму не хапае, аднак патрэба ў будаўніках стала прыкметна меншай. Папулярныя раней бетоншчыкі, муляры, маляры, мантажнікі здалі пазіцыі кандытарам, кухарам, кантралёрам-касірам, электраманцёрам. У гарадах менш за ўсё запатрабаваныя будаўнікі, дарожныя рабочыя, кладаўшчыкі, кіроўцы, аператары ЭВМ, эканамісты, юрысты, юрысконсульты. Назіраецца попыт на ўрачоў, акушэрак, фельчараў, выхавальнікаў і інжынераў-праграмістаў. На вёсцы не хапае жывёлаводаў, аператараў машыннага даення, трактарыстаў, аграномаў, урачоў і ветэрынараў. І амаль не патрэбны машыністы, качагары кацельняў і слесары.

На тое, каб перападрыхтаваць кадры, патрэбны час, а людзі хочуць працаваць сёння.

За 8 месяцаў 14,2 тысячы жыхароў вобласці атрымалі магчымасць працаўладкавацца дзякуючы новым створаным месцам. З іх 6,5 тысячы чалавек знайшлі сабе прымяненне ў сферы гандлю і паслуг.

187 чалавек атрымалі субсідыі на прадпрымальніцкую, рамесніцкую дзейнасць, а таксама для заняткаў аграэкатурызмам. Асабліва паспяхова гэтыя сферы дзейнасці засвойвалі ў Быхаўскім, Глускім, Краснапольскім, Слаўгарадскім раёнах. Мясцовыя органы па працы разам з цэнтрамі прадпрымальніцкай дзейнасці заахвочваюць насельніцтва займацца прыватнай дзейнасцю і праяўляць ініцыятыву. Бізнесмены-пачаткоўцы могуць разлічваць на кансультацыйную, інфармацыйную і метадычную дапамогу.

Каля 5,5 тысячы беспрацоўных скарысталіся часовай магчымасцю падзарабіць на грамадскіх працах — уборцы сельгаспрадукцыі, нарыхтоўцы другаснай сыравіны, добраўпарадкаванні населеных пунктаў і тэрыторый.

Тым, чые прафесіі цяпер не вельмі запатрабаваны на рынку працы, прапаноўвалі перавучыцца. Магчымасцю памяняць прафесію скарысталіся 583 чалавекі, з іх 431 — з гарантыяй далейшага працаўладкавання.

Маладосць плюс вопыт

Вядома, што маладыя кадры не заўсёды ахвотна прыжываюцца на новых месцах. Таму ў калектыўных дагаворах усё часцей з'яўляюцца прывабныя для іх сацыяльныя гарантыі ў выглядзе жылля, павышэння заробку, іншых даброт. Узяты на ўзбраенне і добры вопыт замацавання маладых кадраў за так званымі настаўнікамі — высокапрафесійнымі спецыялістамі.

На падтрымку дзяржавы могуць разлічваць маладыя спецыялісты з абмежаванымі магчымасцямі, якім самастойна цяжка знайсці працу. А таксама людзі, якія вярнуліся з месцаў пазбаўлення волі. За гэтымі катэгорыямі забраніравана сёлета 2220 месцаў. З пачатку года працаўладкавана 1875 такіх работнікаў.

* * *

Дэпутаты прыйшлі да высновы, што для паляпшэння сітуацыі на рынку працы было шмат чаго зроблена. Але не ўсё магчымае. Таму рашэннем аблсавета ўсім зацікаўленым службам рэкамендавана павышаць прэстыж працоўных спецыяльнасцяў сярод моладзі, максімальна стымуляваць развіццё малога і сярэдняга бізнесу, да канца года забяспечыць выкананне задання па стварэнні 2880 дадатковых працоўных месцаў, падтрымліваць маладых спецыялістаў.

Раённым Саветам дэпутатаў, на тэрыторыі якіх зафіксаваны даволі высокі ўзровень беспрацоўя, таксама трэба актывізавацца. Яны са свайго боку павінны ўплываць на паляпшэнне сітуацыі на рынку працы.

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

У СВАЁЙ АКРУЗЕ

КАБ ЖЫЦЬ НЕ ТАК, «ЯК НАБЯЖЫЦЬ»,

або Над чым працуе дэпутат з горада-легенды?

Дэпутат Наталля ГУЙВІК даўно сябруе з ігуменняй Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра Еўдакіяй.

Надзея ЮШКЕВІЧ

Знакаміты Сафійскім саборам, Спаса-Еўфрасіннеўскім манастыром, а таксама славутымі людзьмі — Усяславам Чарадзеем, Еўфрасінняй Полацкай, Францыскам Скарынай — Полацк сёння прыцягвае турыстаў і ўсіх людзей, неабыякавых да гістарычнага мінулага сваёй краіны. Дэпутат Палаты прадстаўнікоў ад Полацкай гарадской выбарчай акругі №28 тыдня паўтара таму, калі я пацікавілася яе працай у славутым горадзе, не стала ўдавацца ў падрабязнасці, а запрасіла мяне прыехаць і ўсё паглядзець. Праз колькі дзён Наталля Васільеўна Гуйвік ужо сустракала мяне на вакзале ў Полацку.

Ранак пачынаецца не з кавы

Я прыехала ў горад у пачатку 12 гадзіны. Аказалася, у гэты дзень дэпутат ужо правяла сустрэчу ў філіяле «Полацкія электрасеткі» РУП «Віцебскэнерга», на якую прыйшло больш за 170 супрацоўнікаў прадпрыемства, і разгледзела два звароты.

— Пасля сустрэч у працоўных калектывах я звычайна трошкі затрымліваюся: не ўсе людзі могуць задаваць асабістыя пытанні ў прысутнасці астатніх, — тлумачыла мне парламентарый. — Такім чынам, атрымліваецца невялікі асабісты прыём. Вось і пасля сустрэчы ў Полацкіх электрасетках да мяне падышлі два чалавекі. Першае пытанне заключалася ў тым, што чалавеку спалілі дом, была заведзена крымінальная справа, але цяпер яна прыпынена. Мужчына з гэтым не згодны. Ён ведаў, што я працавала суддзёй, і спытаў, што яму ў гэтым выпадку рабіць. Я, натуральна, патлумачыла, што ён мае права абскардзіць пастанову аб прыпыненні следчых дзеянняў у пракуратуры Полацкага раёна.

Другі выбаршчык-жанчына пыталася, ці можна арганізаваць аплату за прыватызацыю кватэр праз сістэму АРІП (Адзіная разліковая інфармацыйная прастора) не выходзячы з дому. Гэта пытанне, па словах парламентарыя, узяў на кантроль літаральна ў той жа дзень Аляксандр Сяліцкі, памочнік дэпутата па акрузе, і знайшоў на яго адказ: такі від аплаты можна будзе выкарыстоўваць ужо праз некалькі тыдняў.

Рэха старой і новай гісторыі

Перш-наперш Наталля Васільеўна вырашае пазнаёміць мяне з горадам. І вось мы ў Спаса-Еўфрасіннеўскім жаночым манастыры. Дэпутата тут добра ведаюць, павітацца з намі выходзіць сама настаяцельніца ігумення Еўдакія.

Непадалёк ад манастыра знаходзіцца сумна вядомае ўрочышча Пяскі, пра якое мы расказвалі чытачам нашай газеты ў аднайменным праекце — яго ініцыятаркай з'яўляецца Наталля Гуйвік. У гады вайны на гэтым месцы быў перасыльны нямецкі лагер, тут загінулі, па розных звестках, прыкладна 150 тысяч чалавек. Доўгі час гэтае месца ўяўляла сабой пустку — дажджы размывалі пясок, і астанкі з'яўляліся на паверхні. У самым пачатку сваёй дэпутацкай місіі Наталля Васільеўна паставіла перад сабой задачу — дапамагчы сабраць сродкі і пабудаваць тут мемарыяльны комплекс памяці ахвяр фашызма «Урочышча «Пяскі». Калі б не крызіс 2011 года, помнік бы быў ужо гатовы, аднак з-за скачка курсу долара сабраных грошай стала катастрафічна не хапаць, і пабудова мемарыяла працягваецца дагэтуль.

Суразмоўца паказвае мне і Сафійскі сабор, які стаіць на высокім беразе Заходняй Дзвіны. Шмат чаго ён пабачыў за сваю амаль тысячагадовую гісторыю. Прыгожы і велічны, ён з'яўляецца не столькі культавым аб'ектам (набажэнствы праводзяцца толькі па вялікіх святах), колькі культурным (тут праходзяць канцэрты



арганнай музыкі, фестывалі) і гісторыка-археалагічным помнікам.

З высокага берага Заходняй Дзвіны відаць шпіль лютэранскай кірхі — адной з трох, што захаваліся сёння ў нашай краіне. Аднак пакуль лютэранам яна не належыць, і набажэнствы там не праводзяцца — у гэтым будынку размяшчаецца філіял краязнаўчага музея. Лютэране — а іх у Полацку каля ста чалавек — ужо прасілі перадаць ім кірху, абяцалі адрамантаваць яе на свае сродкі. Але пакуль, на жаль, мясцовыя ўлады не ідуць насустрач, паколькі неабходна знайсці будынак для краязнаўчага музея. Наталля Васільеўна лічыць, што ўсё ж трэба даць ім магчымасць маліцца ў гэтым храме — так, на яе думку, будзе больш справядліва.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

КАБ ЖЫЦЬ НЕ ТАК, «ЯК НАБЯЖЫЦЬ»

Кантрольны спіс

Бліжэй да абеду мы трапляем у кабінет парламентарыя і яе памочніка. Самы час распытаць пра тое, з якімі просьбамі прыходзяць людзі да «свайго чалавека» ў вышэйшым заканадаўчым органе. Аказалася, што якраз 5 кастрычніка Наталля Гуйвік правяла асабісты прыём, на які прыйшлі 16 чалавек. Колькасць зваротаў падчас асабістых прыёмаў даходзіць да 25, а людзі звяртаюцца абсалютна з рознымі пытаннямі.

Усе звароты рэгіструюцца ў спецыяльных кнігах. Там апісваецца сутнасць праблемы ці прапановы, указваецца, на якой стадыі знаходзіцца вырашэнне пытання. Ёсць звароты, якія вырашыць можна літаральна за дзень — як, напрыклад, з магчымасцю плаціць за прыватызацыю праз АРІП, а ёсць і такія, што не вырашаюцца і за год. Такія звароты, адзначае парламентарый, яна бярэ на асабісты кантроль.

Па статыстыцы, 80% зваротаў тычацца работы жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Гэта рамонты пад'ездаў, дахаў, добраўпарадкаванне двароў, пад'язных дарог...

— Быў калектыўны зварот жыхароў вуліцы Ніжнелугавой наконт пастаяннага зацякання вады на гэту вуліцу з вуліцы Асіпенкі. Над гэтай праблемай я б'юся з 28 красавіка 2014 года. Падкрэслю, па многіх пытаннях я і мой памочнік выязджаем па месцы і самі глядзім, чым там можна дапамагчы. Зрабілі запыты ў ЖКГ, Полацкі райвыканкам. Мне напісалі, што работы праведзены. Але, калі я паехала зноў на гэту вуліцу, то ўбачыла, што мяне падманулі. Вялікімі літарамі ў спісе са зваротамі я напісала: «Маняць!». На той вуліцы ўсё засталося па-старому... Гэтае пытанне зараз знаходзіцца на кантролі, і я давяду яго да канца.

Пытанняў, якія не вырашаны, але знаходзяцца на кантролі дэпутата і яе памочніка, у спісе даволі шмат — каля 20.

— Я ніводзін зварот без разгляду не пакідаю — праблема павінна быць вырашана: ці станоўча, ці адмоўна, — кажа мне Наталля Васільеўна. — Натуральна, добра, калі пытанне вырашаецца станоўча; калі ж мне даюць адмоўны адказ, я правяраю, наколькі ён абгрунтаваны, ці сапраўды яго немагчыма вырашыць станоўча.

Людзі прапануюць удасканаліць законы

— Я працую са зваротамі, якія тычацца заканадаўчай ініцыятывы, – расказвае дэпутат. — Быў такі зварот ад адной палачанкі — аб унясенні змен і дапаўненняў у заканадаўства па адзіным падатку з індывідуальных прадпрымальнікаў і фізічных асоб за рэалізацыю кацянят і шчанят, — узгадвае Наталя Гуйвік. — На прыём прыйшла адзінокая жанчына-пенсіянерка і расказала, што ў яе ёсць маленькая гадаванка, якая ашчанілася. Утапіць шчанюкоў шкада, падарыць — таксама шкада. «Я ж пенсіянерка, хоць бы на корм жывёле зарабіць», — падумала жанчына і падала аб'яву ў газету. Аднак ёй зацікавілася падатковая інспекцыя і прапанавала пенсіянерцы заплаціць амаль паўмільённы падатак, а пасля ўжо прадаваць сваіх шчанят. «Якія паўмільёна падатку, калі ў мяне пенсія два мільёны?» — кажа жанчына.

— Яна прыходзіла да мяне на прыём і пыталася: ці можна падыходзіць да людзей індывідуальна ў падатковым пытанні? — расказвае дэпутат. — Калі гэта адзінокі чалавек, які не займаецца развядзеннем жывёлы, не зарабляе на гэтым грошай, дык ці можна ўвогуле вызваліць яго ад гэтага падатку? Натуральна, я накіравала гэты зварот у Міністэрства па падатках і зборах. Па пытанні ўнясення змен у падатковае заканадаўства было адмоўлена, але гэтай жанчыне было рэкамендавана ў наступны раз звярнуцца з заявай у раённы Савет дэпутатаў, які мае права вызваліць яе ад гэтага падатку. Жанчыну адказ задаволіў.

Стукай — і адчыняць

Суразмоўца адзначае, што палачанам уласціва жыць не толькі сваімі асабістымі праблемамі, але і праблемамі горада.

— Быў зварот наконт аднаўлення таблічкі на помніку ў геаграфічным цэнтры Еўропы. У нас жа горад — цэнтр Еўропы, а тут знікла таблічка! Людзі адразу ж заўважылі, звярнуліся, цяпер таблічка адноўлена.

І сама Наталля Гуйвік шмат сіл укладае ў тое, каб захаваць помнікі гісторыі свайго горада, яго культуры, каб Полацк стаў яшчэ больш камфортным для сваіх жыхароў і гасцей.

— Асноўная задача для мяне — выкананне Комплекснай праграмы развіцця Полацка, зацверджанай Указам Прэзідэнта. Напрыклад, будаўніцтва Палаца гульнявых відаў спорту. Адказныя за будаўніцтва — Міністэрства спорту і турызму, Віцебскі і Полацкі аблвыканкамы. Аднак куды мы ні звярталіся — натыкаемся на тое, што няма сродкаў. Пакуль. Мы гэта разумеем, але надзеі не губляем — Палац гульнявых відаў спорту ў нас павінен быць.

Набалелая праблема — Дом афіцэраў у Полацку, які, па словах дэпутата, разбураецца на вачах. Але ж гэта гісторыка-архітэктурны помнік!

— Гэты аб'ект гісторыка-культурнай спадчыны знаходзіцца пад аховай дзяржавы. Я звярталася і ў Міністэрства культуры, і ў Міністэрства фінансаў, і ў Віцебскі аблвыканкам па грашовую дапамогу — мясцовы бюджэт не ў стане «пацягнуць» рэканструкцыю такога вялікага будынка. Хацелася б, каб на гэту праблему звярнулі ўвагу ўсе, хто адказвае за выкананне адпаведнага пункта комплекснай праграмы. Нельга, каб будынкі, якія знаходзяцца пад аховай дзяржавы, разбураліся.

Дэпутат прызналася, што, атрымаўшы адмоўны адказ, яна стараецца не засмучацца.

— Пад ляжачы камень вада не бяжыць, — лічыць яна. — Стукай, і табе адчыняць. Рана ці позна цябе пачуюць і дапамогуць.

Прыклад гэтаму — сітуацыя з капітальным рамонтам старога моста ў Полацку.

— Вельмі шмат было зваротаў наконт яго. Апоры моста маюць амаль стапрацэнтны знос. Давялося пабываць на асабістым прыёме ў губернатара Віцебскай вобласці. З абласнога бюджэту выдзелена 2 мільярды рублёў на завяршэнне праектна-каштарысная дакументацыі. Гэты аб'ект будзе ўключаны ў абласную інвестыцыйную праграму на 2016 год.

* * *

У той дзень у Наталлі Васільеўны былі таксама запланаваны сустрэчы з працоўнымі калектывамі Полацкай універсальнай базы і жыллёва-камунальнай гаспадаркі «Полацк»...

Фота аўтара.

yushkevich@zviazda.by

Узгадвае дэпутат і такі выпадак з нядаўняй практыкі

— Паступіў зварот ад юрыдычнай фірмы: неабходна абараніць канстытуцыйныя правы дзіцяці — грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, якое было, як гаварылася ў звароце, «выкрадзена на праспекце Францыска Скарыны ў Полацку, калі з ім гулялі бабуля і дзядуля». Прыехаў бацька-расіянін з некалькімі сябрамі, выхапіў дзіця з рук і павёз... Я зрабіла запыт у Полацкі РАУС і запрасіла інфармацыю, як расследуецца гэтае здарэнне — ці заведзена справа, ці праводзілася праверка, якія вынікі? Пакуль адказ не прыйшоў. Як толькі прыйдзе, буду думаць, што рабіць далей.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

ПРАЦЭС ПАЙШОЎ

«АБ'ЕКТ» ПАВЫШАНАЙ УВАГІ

На сваёй сесіі дэпутаты Баранавіцкага раённага Савета разгледзелі пытанне аб навядзенні парадку на могілках. Сесія была выязной. Яе ўдзельнікі наведалі аб'екты, абмеркавалі іх стан з вясковымі жыхарамі, старастамі вёсак. Пра тое, якая работа ў раёне вядзецца ў названым кірунку, гутарым са старшынёй раённага Савета дэпутатаў Сяргеем ДЗЯДОВІЧАМ.

Старшыня Баранавіцкага раённага Савета дэпутатаў Сяргей ДЗЯДОВІЧ.

— Першае, з чаго трэба было пачынаць работу, — расказвае Сяргей Іванавіч, — вырабіць праваўстаноўчыя дакументы, а дакладней, акты на зямлю, якія практычна па ўсіх названых аб'ектах адсутнічалі. Райвыканкам выдзеліў грошы на падрыхтоўку дакументацыі. І працэс, што называецца, пайшоў. Наяўнасць дакументаў, як вядома, становіцца першай умовай перадачы аб'ектаў на баланс іншых арганізацый. Так, са 134 могілак (столькі налічваецца ў раёне) трынаццаць перададзена на баланс жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Астатнія пакуль застаюцца на балансе сельсаветаў. Вось яны і з'яўляюцца нашым асаблівым клопатам.

Штогод кожны сельскі Савет складае план мерапрыемстваў навядзення парадку на зямлі. І заўсёды ў гадавым плане прысутнічае раздзел, які датычыць добраўпарадкавання могілак. **Сёння трэба прама гаварыць, што без дапамогі насельніцтва ажыццявіць запланаванае было б вельмі складана. Мясцовая ўлада не мае для гэтага дастаткова фінансаў.** Таму з жыхарамі вёсак, іх дзецьмі, што жывуць у горадзе, праводзіцца адпаведная тлумачальная работа. Як вынік, летась грамадзяне сабралі 238,5 мільёна рублёў. З пачатку года ў раёне ўжо сабрана 354,6 мільёна рублёў. Гэтыя сумы накіроўваюцца ў першую чаргу на пілаванне дрэў і навядзенне агульнага парадку на могілках.

— Хто часцей становіцца ініцыятарам такой работы: сельская ўлада ці самі грамадзяне?

— Бывае і так, і так. Ну вось, напрыклад, жыхарка Баранавіч Стэфанія Рыгораўна Быцко ўзначаліла работу па зборы сродкаў у вёсцы Цюхнявічы Навамышскага сельсавета. Вёска там зусім невялікая. Але яе жыхарам удалося сабраць 14 мільёнаў рублёў. За гэтыя грошы набылі сетку для агароджы. Сельскі Савет дапамог з купляй дроту, слупоў, абсталяваў кантэйнерную пляцоўку. Могілкі былі агароджаны, прыведзены ў парадак, а смецце цяпер своечасова скідваюць у кантэйнер, з якога адходы забірае транспарт ЖКГ.

У вёсцы Залессе Вольнаўскага сельсавета работу з насельніцтвам правялі дзве актывісткі Людміла Уладзіміраўна Бялкова і Марыя Уладзіміраўна Ліцкевіч. Яны сабралі 28 мільёнаў рублёў. Трэба сказаць, што могілкі ў Залессі знаходзяцца даволі далёка ад вёскі, там дарогі нармальнай не было. Да работы падключылася мясцовая гаспадарка — эксперыментальная база «Вольна», а затым і райвыканкам. Паставілі задачу дарожнай арганізацыі, паднапружыліся са сродкамі — і дарогу да могілак нарэшце прывялі ў парадак. Бо да гэтага ў вясновую альбо асеннюю непагадзь нават даехаць з пахавальным картэжам нярэдка станавілася праблемай.

Калі работа ў Залессі пачалася, людзі сабралі яшчэ грошай, усяго сума калектыўнага ўзносу грамадзян склала 55,5 мільёна рублёў. Былі знесены 93 аварыйныя дрэвы. Такім чынам, можна сказаць, што аддаленыя сельскія могілкі прыведзены ў поўны парадак. І гэта прыклад таго, як жыхары населеных пунктаў вырашаюць пытанне разам з уладай. У такіх выпадках, як правіла, не застаюцца ўбаку мясцовыя прадпрыемствы і арганізацыі.

> **Штогод вывозяцца тоны выкінутых на сметнік вянкоў і кветак. Гараць яны добра — але ж спальваць такія спецыфічныя адходы ні ў якім разе не дазволяць эколагі. Выходзіць, застаецца засмечваць зямлю?**

Прывяду яшчэ адзін прыклад, бо ён таксама падаецца характэрным. Могілкі вёскі Навасады, гэта Малахавецкі сельсавет, знаходзяцца ад яе больш чым за тры кіламетры — у лесе. Такое наогул рэдка бывае, каб людзі выбіралі месца спачыну настолькі далёка ад населенага пункта. Там дрэвы былі вельмі старыя і аварыйныя, іх знеслі за кошт сельсавета. Калі я гутарыў з людзьмі з Навасадаў, гаворка зайшла аб установцы агароджы, і вяскоўцы сказалі, што яны для гэтага гатовыя выдаткаваць нават па мільёну рублёў сваіх сродкаў.

— Названыя вёскі вы наведвалі і падчас выязной сесіі?

— Сесія праходзіла ў Малахавецкім сельсавеце. Дэпутаты пазнаёміліся з добраўпарадкаваннем могілак у цэнтры сельсавета, а таксама ў Млынах і Багушах. Усе месцы спачыну прыведзены ў належны парадак. На сесіі нават нарадзілася ініцыятыва па добраўпарадкаванні магілы ўдзельніка вайны ў Афганістане, пахаванага ў Багушах. Дэпутаты сабралі свае грошы на гэтыя мэты. Па-рознаму паварочваецца жыццё. Здараецца, што няма каму даглядаць магілы. Названы выпадак можна аднесці да катэгорыі такіх. Але, на жаль, бывае інакш — калі недалёка жывуць дзеці, унукі, але пра магілы сваіх родных забываюць. Ніхто не наведваецца, нават каб бур'ян вырваць.

Для сесіі мы выбралі названы сельсавет, таму што там ёсць розныя прыклады падыходаў да добраўпарадкавання. Парадак наведзены на ўсіх могілках, але на адных устаноўлена жалезабетонная агароджа, на другіх — драўляная, на трэціх — сетка. Мы раіліся з дэпутатамі, як зрабіць добра і найбольш эканамічна.

— Якія яшчэ праблемы ўздымалі на сесіі дэпутаты?

— На сесіі мы не маглі абысці такое, напрыклад, пытанне, як рост колькасці бытавых адходаў вакол могілак. Усе мы ведаем, што вытворчасць вянкоў, штучных кветак — прыбытковы бізнес, бо названыя тавары цяпер запатрабаваныя. Але іх вытворцы ніяк не паклапаціліся пра далейшую ўтылізацыю або перапрацоўку прадукцыі (як, скажам, вытворцы ПЭТ-бутэлек). Штогод вывозяцца тоны выкінутых на сметнік вянкоў і кветак. Гараць яны добра — але ж спальваць такія спецыфічныя адходы ні ў якім разе не дазволяць эколагі. Выходзіць, застаецца засмечваць зямлю? Думаю, настаў час шукаць падыходы да вырашэння гэтай праблемы. Варта прыдумаць спосабы перапрацоўкі для названых адходаў альбо нейкім чынам мяняць грамадскую думку і адмаўляцца ад моды на штучныя кветкі і вянкі.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

yackevich@zviazda.by

Баранавіцкі раён.

Могілкі ў вёсцы Жалезніца.

ЯК НАПОЎНІЦЬ МАЛОЧНЫЯ РЭКІ?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Напрыклад, браць пробы малака на тлустасць не раз на 10 дзён, а часцей. Гэта будзе дысцыплінаваць людзей, выхоўваць у іх адказнасць і перад суседзямі, і перад дзяржавай. Нікому не прыйдзе ў галаву разбаўляць малако вадой ці выліваць у агульную ёмістасць забруджанае. Малаказдатчыкам хацелася б, каб прыбор для замеру быў непасрэдна ў машыне, як раней, каб кожны ахвотны змог асабіста ўпэўніцца, што яго не падманваюць. А ў лабараторыі па-за кантролем здатчыкаў можна што заўгодна напісаць...

— Тут можна і за людзей заступацца, і за прадпрымальніка Алега Асаёнка, — казалі іншыя. — Дзякуй, што пагадзіўся збіраць малако. У іншых вёсках людзі не ведаюць, куды яго збываць. А тут ніякіх праблем: прыехала машына і цэнтралізавана даставіла сыradой па месцы прызначэння. А што датычыцца людзей, то, безумоўна, яны лічаць, што малако ад яго кароў самае самае. Але ж да кожнага кантралёра не паставіш. Найлепшы кантралёр — асабістае сумленне.

Як распавядае **вядучы спецыяліст Даўгінаўскага сельскага Савета Наталля МІНЧЫК**, малако на тэрыторыі сельсавета збіраецца ў 21 населеным пункце. Яно закупляецца дзяржавай па ніжэйшых коштах у параўнанні з рознічнымі гандлёвымі цэнамі. Тым не менш людзям выгадна яго здаваць. Летась сельсавет заняў першае месца ў раёне па закупцы малака ў насельніцтва, атрымаў прэмію ў памеры 10 базавых велічынь. (За гэтыя сродкі набылі ксеракс, якім карыстаюцца як самі работнікі, так і ўсе ахвотныя жыхары.)

— У нас з індывідуальным прадпрымальнікам Алегам Асаёнкам склаліся добрыя адносіны. Але ж ёсць і праблемы. Напрыклад, прыходзяць людзі, скардзяцца на нізкую тлустасць. Разбіраемся. Да нядаўняга часу ў Алега Яўгенавіча быў абсталяваны пункт у суседнім Куранцы, дзе лабарантка рабіла аналізы. Калі ўзніклі спрэчныя пытанні, ён купіў новы сучасны апарат, які паказвае не толькі колькасць тлушчу, але і шчыльнасць, кіслотнасць, наяўнасць саматычных клетак. Узяў прадпрымальнік і новую лабарантку, якая будзе перыядычна выязджаць разам з вадзіцелем, што збірае малако, — распавяла Наталля Мінчык. — Думаю, калі ўзнікнуць нейкія праблемы, яна зможа некалькі разоў пераправерыць аналізы.

Наталля Віктараўна прывяла канкрэтную сітуацыю. Прыйшла ў сельскі Савет жанчына, паскардзілася, што заніжаюць тлустасць малака ад яе каровы. Узялі пробу паўторна — той жа самы вынік. Зноў не паверыла. І тады старшыня сельскага Савета павёз яе на малочнатаварную ферму, дзе ў яе прысутнасці правялі аналіз, які пацвердзіўся: тлустасць 2,0%.

Больш кабета не з'яўлялася: з фактамі не паспрачаешся...

lazovskaya@zviazda.by

«ЗЯЛЁНЫ ДЗЕНЬ» І ВЫТВОРЧЫ ТУРЫЗМ

У моладзі шмат цікавых, крэатыўных ідэй, якія датычацца мясцовага самакіравання, прычым некаторыя ініцыятывы ўлада ўжо сёння, так бы мовіць, прымае да ўвагі. Такое ўражанне засталося пасля адкрытых гарадскіх дэбатаў «Выбірай.by» у Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы.

Дзве маладзёжныя каманды прапанавалі шэраг праектаў, скіраваных на тое, каб горад над Нёманам стаў яшчэ больш прыгожым, зручным для жыцця і прывабным для турыстаў. Прычым, недастаткова было проста агучыць свой праект — трэба было яго аргументаваць, адстаяць, адказваць на пытанні каманды-саперніцы, студэнтаў з залы, а таксама экспертаў, якімі выступілі прадстаўнікі гарвыканкама, універсітэта, дэпутацкага корпусу.

Зразумела, далёка не кожная прапанова мае рэальныя шанцы на ажыццяўленне. Напрыклад, як ставіцца да ідэі наземнага метро ў Гродне? Наколькі гэта мэтазгодна для горада, які не з'яўляецца мегаполісам? І якая, так бы мовіць, цана пытання? Тым не менш старшыня Гродзенскага гарвыканкама Мечыслаў Гой не назваў гэту хутчэй нават не ідэю, а мару ўтапічнай. Можа, у будучыні з'явіцца і такі від грамадскага транспарту?

А некаторыя прапановы могуць увасобіцца ў жыццё даволі хутка, прычым без бюджэтных затрат ці замежных інвестыцый. У прыватнасці, мэр падтрымаў ідэю заснавання ў Гродне свята па азеляненні горада пад назвай «Зялёны дзень». Альбо хіба ж не рэальна развіваць на базе шэрагу прадпрыемстваў вытворчы турызм, у тым ліку і з прафарыентацыйнымі мэтамі для школьнікаў?

Прагучалі падчас дэбатаў і прапановы, актуальныя не толькі для асобнага рэгіёна, але і для краіны ў цэлым. Напрыклад, прыняць алкагольную і тытунёвую прадукцыю з зоны крокавай даступнасці і прадаваць яе толькі ў спецыялізаваных крамах.

У ТЭМУ

Убачыць, як рэалізуецца на практыцы аднойчы выказаная ідэя, можна, напрыклад, у аграгурыстычным комплексе «Гарадзенскі маёнтак «Каробчыцы». Нядаўна тут адбыўся ўжо сёмы міжнародны пленэр рэзчыкаў па дрэве. Гаспадар комплексу — Гродзенскі мясакамбінат — забяспечвае іх драўнінай для творчасці, пражыванне і харчаванне, а ўсе скульптуры застаюцца ў маёнтку і радуюць яго наведвальнікаў. Сёлета дзякуючы майстрам з Беларусі, Літвы, Польшчы, Расіі і Украіны ў «Каробчыцах» пасяліліся героі пушкінскіх казак.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

prakopchik@zviazda.by

СВАІМІ РУКАМІ

МАЙСТРЫХА АЛМАЗНАЙ ВЫШЫЎКІ

Загадчыца ФАПа з вёскі Азіна Полацкага раёна ў вольны час займаецца... «алмазнай» вышыўкай, вязаннем і шыццём. Яе прысядзібны ўчастак — самы добраўпарадкаваны ў вёсцы. Ці не нагода завітаць у госці?

На падворку **Алены ГЛІНСКАЙ** — драўляны млын, казачны дамок, альтанка... Такую прыгажосць цяжка не заўважыць, калі праязджаеш міма.

— Загадчыца нашага ФАПа Алена Анатолеўна — спецыяліст вышэйшай катэгорыі. Пра такіх кажуць: прафесіянал з вялікай літары. Вяскоўцы яе за гэта вельмі паважаюць. А яшчэ ў яе залатыя рукі, а двор самы прыгожы не толькі ў вёсцы, але і ў раёне. Алена Анатолеўна двойчы была пераможцай у раённым рэйтынгу: па лепшым домаўладанні і добраўпарадкаванні і па творчых работах. І сёлета, упэўнена, ёй ёсць чым здзівіць. Убачыце яе творы — самі ўсё зразумееце, — расказвае **старшыня Азінскага сельскага Савета Алена ЧУВАШЭНКА**.

— У гэтым рэйтынгу штогод вызначаюцца самыя адораныя людзі, найлепшыя населеныя пункты і гэтак далей. І часам адказныя асобы самі здзіўляюцца таленту і крэатыўнасці сваіх землякоў. Пераможцы атрымліваюць прызы, заахвочваюцца па месцы жыхарства, — дадае **Валянціна УЛАСЕНКА, прэс-сакратар Полацкага райвыканкама**.

Вось такі сімпатычны падворак.

Гаспадыня запрасіла нас у дом. Калі выказалі захапленне ўбачаным, патлумачыла, што шмат з гэтага зрабілі бацька і муж, які працуе мантажнікам на наваполацкім прадпрыемстве. Дарэчы, пакоі ў доме таксама вельмі стыльныя, утульныя.

— Ды нічога асаблівага, мы ж у вёсцы жывём, — пажартавала гаспадыня.

Усім бы так жыць. Творы Алены Анатолеўны можна выстаўляць у музеі.

— Мне проста падабаецца нешта рабіць сваімі рукамі. Лічу, што кожная жанчына, калі б захацела, змагла стварыць такое ж. Раней выццём і вязаннем займалася. А летась купіла набор для вышыўкі стразамі... Калі правільна казаць, такая тэхніка мае назву «алмазная вышыўка». І наборы для вырабу прадаюцца. Вось на гэтую ікону спатрэбілася 12,7 тысячы стразаў. Не магу дакладна сказаць, колькі часу патрабуецца, каб зрабіць карціну, бо не кожны дзень удаецца вышываць, — распавядае Алена Глінская.

У ФАПе яна і фельчар, і акушэр, і аптэкар. Абслугоўвае жыхароў 12 вёсак. Бывае, дамоў прыходзіць бліжэй да ночы. Таму, зразумела, часу на творчасць мала, бо трэба ж паспець і хатнія справы парабіць. Яшчэ адно яе хобі — прыгатаванне нацыянальных беларускіх страў. Пачаставала беляшамі, дык ледзь язык не праглынуў.

На развітанне папрасіў паказаць увесь прысядзібны ўчастак. Гаспадары вырошчваюць на ім не толькі садавіну, агародніну, але і шмат кветак... Прыемна, што зямля беларуская, як калісьці, багатая не толькі на працавітых, але і на творчых людзей. Такіх не вабіць шум вялікіх гарадоў. Яны жывуць у глыбінцы ў гармоніі з сабой, прыродай і людзьмі. Вучаць аднаяскоўцаў таму, што пры жаданні можна зрабіць сваё жыллё прыгожым — такім, куды заўсёды хочацца вяртацца...

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

pukshanski@zviazda.by

Фота аўтара.

Полацкі раён.

Алена ГЛІНСКАЯ *(справа)* з дачкой.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказная за выпуск КАРПЕНКА Н.У.

Грамадскі савет: **ГЕРАСІМОВІЧ С.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **АСКЕРКА Ю.В.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **НАВУМЕНКА А.В.**, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН: 292 44 12;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 20.654. Нумар падпісаны ў 19.30 13 кастрычніка 2015 года.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Наименование	Характеристика
ЛОТ 1	
Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения	- капитальное строение, инв. № 450/С-21886 (назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – здание заправочной с пристройкой) площадью – 50,5 кв.м; - капитальное строение, инв. № 450/С-21893 (назначение – здание специализированное для общественного питания, наименование – столовая) площадью – 126,0 кв.м; - капитальное строение, инв. № 450/С-21894 (назначение – здание специализированное здравоохранения и предоставления социальных услуг, наименование – ФОК) площадью – 310,0 кв.м; - капитальное строение, инв. № 450/С-21881 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – контора) площадью – 661,0 кв.м; - капитальное строение, инв. № 450/С-21878 (назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – здание диспетчерской) площадью – 249,0 кв.м; - капитальное строение, инв. № 450/С-21890 (назначение – здание специализированное коммунального хозяйства, наименование – здание котельной с сушилкой) площадью – 102,0 кв.м; - капитальное строение, инв. № 450/С-22912 (назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т.ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), наименование – здание водомаслогрейки) площадью – 62,8 кв.м; - капитальное строение, инв. № 450/С-21884 (назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – участок № 1) площадью – 554,0 кв.м; - капитальное строение, инв. № 450/С-22913 (назначение – здание иного назначения, наименование – навес) площадью – 163,4 кв.м; - капитальное строение, инв. № 450/С-21891 (назначение – здание специализированное для бытового обслуживания населения, наименование – туалет) площадью – 21,0 кв.м; - капитальное строение, инв. № 450/С-21888 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – здание плотницкой, склада шин) площадью – 201,0 кв.м; - капитальное строение, инв. № 450/С-21882 (назначение – здание специализированное для переработки нефти и газа, производства химических веществ, резиновых и пластмассовых изделий, прочих неметаллических минеральных продуктов, наименование – навес для сброса газа) площадью – 82,0 кв.м; - капитальное строение, инв. № 450/С-21889 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – здание склада) площадью – 543,0 кв.м; - капитальное строение, инв. № 450/С-21883 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – здание склада) площадью – 448,0 кв.м; - капитальное строение, инв. № 450/С-1523 (назначение – здание нежилое участка № 2, наименование – здание участка № 2) площадью – 1125,0 кв.м; - капитальное строение, инв. № 450/С-21885 (назначение – здание обрабатывающей промышленности иного назначения, наименование – здание мастерских) площадью – 2182,0 кв.м; - капитальное строение, инв. № 450/С-21892 (назначение – здание специализированное для лечебно-профилактических и санаторно-курортных целей, наименование – здание профилактория) площадью – 682,0 кв.м; - капитальное строение, инв. № 450/С-21887 (назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – здание моечной с очистительными сооружениями) площадью – 414,0 кв.м; - капитальное строение, инв. № 450/С-26814 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – воздушная линия электропередачи 0,кВт) протяженностью – 654,0 м; - капитальное строение, инв. № 450/С-26815 (назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, наименование – артезианская скважина) площадью – 15,2 кв.м; - капитальное строение, инв. № 450/С-26904 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – канализационная сеть) протяженностью – 273,0 м; - капитальное строение, инв. № 450/С-26906 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – ливневая канализация) протяженностью – 727,0 м; - капитальное строение, инв. № 450/С-26907 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – тепловая сеть) протяженностью – 298,0 м; - капитальное строение, инв. № 450/С-26905 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – очистные сооружения) площадью – 112,0 кв.м; - капитальное строение, инв. № 450/С-26903 (назначение – сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства, наименование – асфальтобетонное покрытие) площадью – 22800,0 кв.м; - пруды, количеством 4 шт., общей площадью 1,8 га; - труба дымовая металлическая высотой 18 м
Земельный участок, на котором расположен объект	Кадастровый номер 425483307102000268 (назначение – земельный участок для обслуживания зданий и сооружений площадью 8,4690 га, расположенный по адресу: Слонимский р-н, д. Чемеры, ул. Грибовская, 1). Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельный участок, находящийся в водоохранной зоне водного объекта, код – 4,1, площадью 8,4690 га
Обременения со стороны 3-х лиц	- капитальное строение, инв. № 450/С-21886, площадью 59,5 кв.м, сроком по 30.10.2017 г.; - часть капитального строения, инв. № 450/С-21885, площадью 101,1 кв.м, сроком по 31.01.2018 г. и площадью 30,8 кв.м сроком по 28.02.2017 г.; - капитальное строение, инв. № 450/С-21888, площадью 201,0 кв.м, сроком по 31.03.2017 г.; - часть капитального строения, инв. № 450/С-21889, площадью 88,5 кв.м, сроком по 08.02.2017 г.; - часть капитального строения, инв. № 450/С-1523, площадью 416,8 кв.м, сроком по 14.12.2017 г.; - часть капитального строения, инв. № 450/С-21878, площадью 49,2 кв.м, сроком по 28.02.2017 г.; - часть капитального строения, инв. № 450/С-21884, площадью 223,3 кв.м, сроком по 28.02.2017 г. и площадью 42,6 кв.м, сроком по 31.03.2017 г.; - часть капитального строения, инв. № 450/С-26903, площадью 650,0 кв.м, сроком по 14.12.2017 г., площадью 870 кв.м, сроком по 30.10.2017 г., площадью 300 кв.м, сроком по 31.03.2017 г., площадью 5680 сроком по 28.02.2017 г.
Начальная цена продажи	9 422 042 925 (девять миллиардов четыреста двадцать два миллиона сорок две тысячи девятьсот двадцать пять) белорусских рублей с учетом НДС
Сумма задатка	471 102 146 (четыреста семьдесят один миллион сто две тысячи сто сорок шесть) белорусских рублей
Продавец	Филиал «Автобусный парк № 3 г. Слоним» ОАО «Гроднооблавтотранс», 231800, г. Слоним, ул. Чкалова, 32, тел./факс 8-01562-25-471
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34
Условия аукциона	Без условий
Условия оплаты	По договоренности сторон
Срок заключения договора купли-продажи	Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/с для перечисления задатка	р/с 3012215030011 в ЦБУ № 422 филиала № 402 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Слоним, ул. Черняховского, 3, БИК 152101689, УНП 500836066. Получатель – Филиал «Автобусный парк № 3 г. Слоним» ОАО «Гроднооблавтотранс»
Аукцион состоится 25 ноября 2015 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209	
К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица; *индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются: представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя; физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица; представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов по названной аукционистом цене. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. **Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 14.05.2015 г.**	
Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг), с 8.30 до 16.30 (пятница)	
Последний день приема заявлений – 19 ноября 2015 г. до 15.00	

Телефон для справок: 41-98-32, 41-98-34 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Наименование	Характеристика
ЛОТ 1	
Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения	Капитальное строение, инв. № 400/С-43801 (назначение – дом рыбака, наименование – дом рыбака) площадью 378,3 кв.м, расположенное по адресу: Гродненский р-н, Поречский с/с, д. Новая Руда. Составные части и принадлежности: сети электроснабжения, канализационная сеть
Земельный участок, на котором расположен объект	Кадастровый номер 422087507601000115 (назначение – земельный участок для эксплуатации и обслуживания дома рыбака) площадью 0,1500, расположенном по адресу: Гродненский р-н, Поречский с/с, д. Новая Руда. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли, находящиеся в водоохранных зонах водных объектов вне прибрежных полос, код – 2, площадью 0,1500 га
Начальная цена продажи	1 056 759 600 (один миллиард пятьдесят шесть миллионов семьсот пятьдесят девять тысяч шестьсот) белорусских рублей с учетом НДС
Сумма задатка	52 837 980 (пятьдесят два миллиона восемьсот тридцать семь тысяч девятьсот восемьдесят) белорусских рублей
Условия аукциона	Без условий
Продавец	Учебно-опытный сельскохозяйственный производственный кооператив «Путришки», 231750, Гродненский р-н, а.г. Путришки, ул. Тарханова, 49, тел. 917-147
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 41-98-32, 41-98-34
Условия оплаты	По договоренности сторон
Срок заключения договора купли-продажи	Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/с для перечисления задатка	Р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка 153001739, УНП 500833225
Аукцион состоится 16 ноября 2015 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209	
